Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛЮТАГА 2016 г. СУБОТА № 23 (28133) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Шчаслівыя ў... глушы

СТАР. 7

У кожнага ёсць шанц стаць пісьменнікам

СТАР. 8

Наркаманія — не прысуд

СТАР. 11

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:

«Падатковая сістэма Беларусі ў 2016 годзе будзе заставацца стабільнай. Па выніках мінулага года больш за 70% даходнай часткі бюджэту сфарміравана за кошт даходаў, якія кантралююцца падатковымі органамі. Паказальна, што ў апошнія гады расце доля плацяжоў, якія паступаюць добраахвотна. Гэта адлюстроўвае стратэгію работы падатковых органаў: каб даходы раслі не за кошт штрафных санкцый, а добраахвотных паступленняў. У той жа час нядобрасумленныя плацельшчыкі вылічваюцца з дапамогай інфармацыйных сістэм, праграмных прадуктаў, якія палягчаюць працу па прыцягненні іх да адказнасці».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.02.2016 г.

Долар ЗША	21668,00	▲
Еўра	24246,00	▲
Рас. руб.	280,38	▼
Укр. грыўня	836,60	▲

ISSN 1990 - 763X

НА БАБУЛІНЫХ КРОСНАХ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Камуна Любанскага раёна Ірына ЯСКЕВІЧ стала найлепшай майстрыхай 2015 года: яна ўдзельнічала ў творчым конкурсе «Алімп Міншчыны» — адмысловым спаборніцтве крэатыўных праектаў і асоб. Ірыне Васільеўне ўручаць Гран-пры. Яна доўгі час займаецца традыцыйным ткацтвам, захоўвае сакрэты старажытнага любанскага рукадзелля, мае званне народнага майстра Беларусі.

■ Размова па сутнасці

ЁСЦЬ ТАКАЯ ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ — ЧЫТАЦЬ

Міністр інфармацыі — аб пераемнасці ў літаратуры, мультымедыйных кнігах і ўласнай бібліятэцы

Фота Надзеі БУЖАН.

XXIII Мінская міжнародная выстава-кірмаш, якая распачне сваю работу на пачатку наступнага тыдня, — адно з самых значных мерапрыемстваў года для пісьменнікаў, выдаўцоў і чытачоў. За гады свайго існавання яна ператварылася ў сапраўдны міжнародны форум, на якім не толькі экспануюць найлепшыя выданні, але і ладзяць дыскусіі і прэзентацыі, даюць старт цікавым праектам, наладжваюць прафесійныя і сяброўскія сувязі, разважаюць аб ролі мастацкага слова ў сучасным грамадстве. Менавіта таму тэма нашай размовы з міністрам інфармацыі Ліліяй АНАНІЧ атрымалася значна шырэйшай, чым аб праграме маючай адбыцца выставы-кірмашу. Была зацікаўленая гутарка аб стане кнігавыдання, аб кантактах і перспектывах выдавецкай і пісьменніцкай супольнасці, аб юбілеі нашай першай кнігі і нават аб чытацкіх перавагах самой суразмоўцы...

— Лілія Станіславаўна, кніжная выстава-кірмаш праводзіцца ў нашай сталіцы ўжо дваццаць трэці раз. Суполка ж кнігавыдаўцоў і літаратараў даволі цесная і, скажам так, кансерватыўная. Ці не значыць гэта, што на выставе штогод «знаёмыя ўсё тварыы»?

— Не пагаджуся з тым, што суполка кнігавыдаўцоў сціслая. Пра гэта сведчыць перш за ўсё статыстыка: у Дзяржаўным рэестры выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў друкаваных выданняў на пачатак гэтага года ў якасці выдаўцоў зарэгістравана 485 суб'ектаў гаспадарання. 181 з іх — дзяржаўнай формы ўласнасці, 231 — прыватнай, 44 — індывідуальныя прадпрымальнікі. 19 рэлігійных і 10 грамадскіх арганізацый таксама маюць статус выдаўца. І многія з гэтых выдавецтваў будуць прадстаўлены на выставе.

СТАР. 3

■ Прафсаюзы: з людзьмі і для людзей

Аляксандр БОЙКА:

«МЫ БУДЗЕМ І ДАЛЕЙ СТУКАЦЦА ВА ЎСЕ ДЗВЕРЫ»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі — адзін з найбольш уплывовых у краіне — адзначае сваё 95-годдзе. Сярод галіновых прафсаюзаў гэта другая па колькасці арганізацыя, якая аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах 600 тысяч чалавек: работнікаў як дзяржаўных, так і прыватных установ адукацыі, навучэнскую моладзь, аспірантаў, дактарантаў, а таксама замежных студэнтаў. Іх заваёвы і праблемы, занятасць і заробак — штодзённы клопат прафсаюзнай арганізацыі. Да слова, пяць гадоў, што прайшлі з апошняй юбілейнай даты, змясцілі ў сабе цэлую эпоху, якая ўключае рэарганізацыю і аптымізацыю сеткі ўстаноў адукацыі, змяненні ў парадку атэстацыі педагагічных работнікаў, павелічэнне педагагічнай нагрузкі, апрабацыю галіновай сістэмы аплаты працы, мадэрнізацыю ўсёй адукацыйнай сістэмы, барацьбу за канкурэнтаздольнасць педагагічнай прафесіі і многае іншае. 95-годдзе — цудоўная нагода, каб азірнуцца назад. Мы сустрэліся са старшынёй Цэнтральнага камітэта Аляксандрам БОЙКАМ, каб даведацца, ці заўсёды ўдаецца данесці пазіцыю большасці членаў галіновага прафсаюза да ўладных структур і на якіх кірунках трэба засяродзіць увагу.

Праблема нумар адзін

— Аляксандр Аляксандравіч, сацыяльны статус педагога — сёння праблема нумар адзін. Моладзь не прываблівающь педагагічныя спецыяльнасці, а маладыя спецыялісты не затрымліваюцца ў школах. У тым ліку і з прычыны невысокіх заробкаў...

— Павышэнне прэстыжу педагагічнай прафесіі праз пошук механізмаў рэальнай абароны работнікаў галіны — гэтую задачу прафсаюз лічыць асноўнай. Па ўсіх прынцыповых пытаннях мы выказваем сваю афіцыйную пазіцыю, нават калі яна і не знаходзіць падтрымкі наверсе...

СТАР. 4

РАЗАМ — СУПРАЦЬ СУЧАСНЫХ ВЫКЛІКАЎ

Беларусь і Расія маюць намер прадоўжыць умацаванне двухбаковага ўзаемадзеяння па ўсіх напрамках

Такая дамоўленасць дасягнута ў час сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, якая адбылася 5 лютага ў Сочы, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.

Асноўная ўвага ў час перагавораў была ўдзелена маючым адбыцца ў лютым важным для беларуска-расійскага ўзаемадзеяння падзеям. У прыватнасці, лідары дзвюх дзяржаў падрабязна разгледзелі парадак дня намечанага на люты пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што папярэдне гэту тэму ён абмеркаваў у Сочы з кіраўніком расійскага ўрада. «У нас была магчымасць сустрэцца з прэм'ер-міністрам Дзмітрыем Мядзведзевым па вашым даручэнні. Мы падрабязна гаварылі аб пасяджэнні ВДС, а таксама аб пасяджэнні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе ў Магілёве», — канстатаваў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Уладзімір Пуцін падкрэсліў важнасць перагавораў з Прэзідэнтам Беларусі напярэдадні пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета. «Вельмі рады вас бачыць, — сказаў расійскі лідар. — Нам ёсць аб чым пагаварыць». Прэзідэнт Расіі прапанаваў пагаварыць «наконт бягучых двухбаковых спраў і аб рэгіянальных пытаннях, а таксама аб сумесных намаганнях па ўмацаванні інтэграцыйных працэсаў». З улікам маючых адбыцца беларуска-расійскіх мерапрыемстваў прэзідэнты Беларусі і Расіі ўзгаднілі пазіцыі па шэрагу пытанняў.

Лідары дзвюх краін пагадзіліся з тым, што неабходна аб'ядноўваць намаганні ва ўмовах сучасных выклікаў. Акрамя таго, на перагаворах Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін закранулі пытанні міжнароднага парадку дня, тэму міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі.

ДАВЕР, ЯКІ ВАЖНА АПРАЎДАЦЬ

Гораду Маладзечна перадалі эстафету культурнай сталіцы 2016 года

Урачыстая цырымонія перадачы эстафеты добрых спраў ад Года моладзі Году культуры ўчора адбылася ў Палацы культуры горада Маладзечна. Кінематаграфісты і тэатралы, бібліятэкары і музейшчыкі, рэстаўратары і архітэктары сабраліся тут, каб павіншаваць маладзечанцаў з такой адметнай місіяй.

Фота БЕЛТА.

У гэты ж дзень адбылася і выязная калегія Міністэрства культуры Беларусі. Падчас яе **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што рашэнне аб'явіць сёлетні год Годам культуры — знакавая падзея для ўсёй галіны. Гэта давер, які важна апраўдаць. Але тое, як пройдзе гэты год, залежыць і ад іншых ведамстваў, і ад усяго насельніцтва, таму што культуру можна разглядаць у розных аспектах. «Сэнс Года культуры больш шырокі і заключаецца не толькі ў правядзенні культурных мерапрыемстваў, творчых праектаў, — адзначыла Наталля Качанава. — Гэта датычыцца і культуры паводзін, і адносін адно да аднаго, і іншых бакоў жыцця».

Віцэ-прэм'ер звярнула ўвагу і на важнасць падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў у гэтай галіне, на тое, каб маладыя спецыялісты былі зацікаўлены ў працягненні кантрактаў на месцах размеркавання, каб не гублялася пераемнасць з найлепшымі старэйшымі майстрамі сваёй справы. Для гэтага як у рэгіёнах, так і ў сталіцы трэба ствараць адпаведныя ўмовы.

Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ звярнуў увагу на цэлы шэраг праблем, якія ёсць у галіне і якія трэба пастарацца вырашыць сёлета. Так, разглядаючы працу музеяў, ён адзначыў, што ім неабходна актывізаваць выставачную дзейнасць. Міністр звярнуў увагу і на адсутнасць дастатковых фондасховішчаў. Але дадаў, што ў гэтым годзе плануецца набыць рэстаўрацыйнае і фондавае абсталяванне і правесці рэстаўрацыю музейных прадметаў.

Барыс Святлоў адзначыў, што летась скарацілася колькасць наведвальнікаў тэатраў. Гэтая праблема, на яго думку, выклікана недастатковай гнуткай рэпертуарнай палітыкай.

Выклікае незадаволенасць у кіраўніка галіны культуры і тое, як працуе нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм». «Яны не могуць вызначыцца са сваімі ідэйна-мастацкімі прыярытэтамі, — лічыць Барыс Святлоў. — Многія супрацоўнікі прытрымліваюцца старых поглядаў і зацікаўлены толькі ў тым, каб засвоіць грошы». Таму перад «Беларусьфільмам» пастаўлена задача: у першай палове 2016 года выйсці на бясстратную дзейнасць.

Увогуле, страты пэўнай колькасці чытачоў, гледачоў, слухачоў — гэта, падкрэсліў міністр, пралік на месцах, у кожным канкрэтным выпадку. Нельга дапускаць такія пралікі пры выкананні праграмы «Культура Беларусі» на 2016—2020 гады.

На думку міністра, у сучасным грамадстве, перанасычаным інфармацыяй, рознымі, часам супрацьлеглымі поглядамі, не хапае цэнзуры, якая існавала ў савецкі час. Хто б мог выконваць яе функцыю сёння? З такой задачай справіліся б прадстаўнікі творчых саюзаў, лічыць ён.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*
Маладзечанскі раён.

■ Спажывец

КУПЛЯЦЬ І НЕ БАЯЦЦА

Сертыфікацыя тавараў робіцца дзеля інтарэсаў пакупніка і правесці яе ёсць усе магчымасці

Некалькі гадоў таму, калі мой малодшы сын яшчэ гуляў у пясочніцы, яго бабулі набывалі на рынках сваіх райцэнтраў розныя яркія цацкі. Падарункі ўнуку ад іх звычайна былі гумавыя ці пластмасавыя і вельмі прыгожыя, аднак... Пасля майго больш скрупулёзнага аналізу, гэтыя рэчы ў рукі малога так і не траплялі. Сумненні выклікалі нейкі ненатуральна-хімічны пах ад іх і не зусім зразумелая маркіроўка замежнага вытворцы. Мой сын быў тады яшчэ даволі малы і мог пакаштаваць цацку на смак. Менавіта гэтага я і баяўся, бо нават прадавец на рынку не ведаў таго, якая фарба нанесена на цацку, а адпаведных дакументаў у прадпрымальніка не было... Тое самае можна было сказаць і пра танныя і яркія прадметы адзення, якія прадаваліся на рынку.

Сёлета сітуацыя з прадукцыяй лёгкай прамысловасці, якую прадаюць індывідуальныя прадпрымальнікі на рынках, зноў апынулася ў цэнтры ўвагі. Патрабаванні тэхнічнага рэгламенту Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС), які пачаў дзейнічаць яшчэ ў ліпені 2012 года, не ўспрымаюцца гандлярамі на ўра, асабліва тымі, для каго звыкла працаваць па «шэрай» схеме.

Умовы створаны

Усе патрабаванні тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза (МС) цалкам выканальныя, заявіў учора **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі Сяргей ІЎЛЕЎ** на брыфінгу, які быў прысвечаны пытанням пацвярджэння адпаведнасці тэхрэгламенту МС тавараў легпрама, што рэалізуюцца ІП на рынках.

На яго погляд, сёння створаны ўсе ўмовы, каб нармальна прасоўваць прадукцыю легпрама на рынкі ЕАЭС, вырабляць гэтую прадукцыю на нашай тэрыторыі. «Таму той, хто хоча нармальна дзейнічаць (а такіх дастаткова шмат), будзе гэта рабіць. Усе патрабаванні выканаць сапраўды магчыма, а потым ужо цывілізавана выступаць з гэтай прадукцыяй на рынках», — падкрэсліў прадстаўнік Дзяржстандарта. Паводле яго слоў, спажыўцы павінны быць зацікаўлены ў набыцці якаснай прадукцыі. «Усе мы павінны купляць прадукцыю, якая не прынясе нам шкоды, якая будзе бяспечная і якой мы будзем карыстацца з задавальненнем, калі будзем у ёй ўпэўнены», — заўважыў Сяргей Іўлеў.

Разам з тым ён адзначыў, што пакуль нельга сказаць, што індывідуальныя прадпрымальнікі ў поўнай меры выконваюць заканадаўства. Прычыны, напэўна, будуць рознымі. Частка прадпрымальнікаў усё ж такі недастаткова сур'ёзна ўспрымае ўсе патрабаванні тэхнічнага рэгламенту, а нехта выканаў іх не канчаткова. Сяргей Іўлеў заўважыў, што ў прадпрымальнікаў была і ёсць магчымасць атрымаць усю неабходную інфармацыю. Арганізацыі Дзяржстандарта рэгулярна аказваюць кансультацыі, у тым ліку і падчас маніторынгаў.

Пакуль без жорсткіх праверак

Сяргей Іўлеў паведаміў, што на І паўгоддзе камітэтам не запланавана правядзенне праверак прадпрымальнікаў на рынках. У планавым парадку гэта рабіць не будуць. Але спецыялісты збіраюцца маніторыць сітуацыю. Будуць абавязкова наглядаць за тымі, хто размяшчае на рынках вялікія партыі прадукцыі. Гэта могуць быць не толькі індывідуальныя прадпрымальнікі. «Менавіта ў гэтых выпадках, калі ўзнікае сітуацыя з пастаўкай тавараў, якія не адпавядаюць патрабаванням, будуць прызначацца пазапланавыя праверкі, і гэтыя суб'екты будуць правярацца ў поўным аб'ёме. Вось такую тактыку мы для сябе прынялі», — падкрэсліў Сяргей Іўлеў.

Паводле яго слоў, часам жаданне атрымаць максімальны даход перасільвае абавязацельствы ў дачыненні да таго, каб прапанаваны пакупнікам тавар быў легальны і адпавядаў нормам бяспекі. «Справа тут выключна ў грошах, калі ўзнікае эканамічны інтарэс купіць вельмі танны тавар і прадаць яго максімальна дорага. Гэтая самая маржа, якая атрымліваецца пры такой аперацыі, часам засланяе вочы і выходзіць на першае месца», — лічыць спецыяліст.

Таксама ён адзначыў, што ў нашай краіне створаны аптовыя структуры, дзе можна легальна набыць тавар для наступнай рэалізацыі на рынках і ў гандлёвых цэнтрах. У гэтых выпадках прадпрымальніку ўвогуле не трэба клапаціцца аб правядзенні сертыфікацыі або дэкларавання адпаведнасці тавараў лёгкай прамысловасці. Падобныя аптовыя структуры створаны і ў іншых краінах ЕАЭС, імі можна карыстацца. «Але прадпрымальнік — гэта чалавек, які выбірае свой шлях паводзін, ён сам арганізоўвае свой бізнес. Мы тады яму гаворым: арганізоўваеш выключна свой бізнес, калі ласка, выконвай правілы», — дадаў Сяргей Іўлеў.

Салідныя імпарцёры наваўвядзенне вітаюць

Намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Ігар ГАЕЎСКІ лічыць, што сур'ёзныя пастаўшчыкі замежных тавараў зацікаўлены ў правядзенні санітарна-гігіенічнай экспертызы.

Нейкага раздражнення гэтая працэдура ні ў каго не выклікае. «На сустрэчах з кіраўніцтвам прадпрымальніцкіх саюзаў, з прадстаўнікамі замежных кампаній, якія прыязджаюць на наш рынак і жадаюць гандляваць, мы ўсё даўно растлумачылі, а яны пагадзіліся. І сур'ёзныя пастаўшчыкі тавараў падтрымліваюць гэтую меру», — адзначыў намеснік міністра.

Паводле яго слоў, такая падтрымка звязана з тым, што цяпер часцяком пад выглядам сур'ёзных брэндаў могуць прадавацца фальсіфікаваныя тавары. «Гэта ненармальна, калі вядомыя пастаўшчыкі вымушаны канкурыраваць з ценявым рынкам, ценявым вытворцам. Таму яны зацікаўлены, каб санітарна-гігіенічная экспертыза была, каб яе неабходна было прайсці ўсім, і за межамі рынку засталіся тыя прадпрымальнікі, якія не хочуць гандляваць нармальным таварам», — патлумачыў сітуацыю Ігар Гаеўскі.

Забракавалі 97 партый, дзе 48 — посуд

Санітарна-гігіенічная экспертыза і іншыя меры па пацвярджэнні якасці тавараў павінны існаваць для абароны спажыўцоў. Інакш нельга, бо малады бізнес бывае вельмі жорсткім. «Часам няма мяжы чалавечай сквапнасці. І калі раптам замаячыць нейкая перспектыва, што можна прадаваць любы тавар і атрымліваць звышпрыбытак, то сустракаюцца людзі, якіх не спыняе нічога. Нават здароўе чалавека», — кажа намеснік міністра.

Увогуле экспертыза штодня выяўляе ў Беларусі няякасныя імпартныя тавары, якія да гэтага набываліся на рынках. З моманту прыняцця пастановы №666 адпаведнымі службамі Міністэрства аховы здароўя было аформлена 11,5 тысячы санітарна-гігіенічных заключэнняў. Спецыялісты выявілі 97 партый прадукцыі, якая не адпавядае паказчыкам бяспекі. Гэта посуд, касметычныя сродкі, харчовая прадукцыя, тавары для дзяцей, вырабы, якія выкарыстоўваюцца для пітнога водазабеспячэння. Паказчыкі сапраўды ўражваюць, бо сярод забракаванай небяспечнай прадукцыі выяўлена ажно 48 партый посуду. «На жаль, вымушаны канстатаваць, што кожны працоўны дзень мы выяўляем нестандартную прадукцыю», — адзначыў ён.

Экспертыза ўсім па кішэні

Кажучы аб кошце працэдуры гігіенічнай экспертызы, галоўны санітарны ўрач растлумачыў, што сёння гэта працэдура каштуе ад 120 тысяч да 170 тысяч рублёў. Гэта ў тым выпадку, калі кліентам прадастаўлены аптымальны набор дакументаў. Зусім іншая сітуацыя складваецца, калі на экспертызу прыносяць амаль «шэры» тавар без адпаведных дакументаў. Калі для выяўлення параметраў бяспекі прадукцыі неабходна праводзіць дэталёвыя лабараторныя даследаванні, то кошт экспертызы будзе вышэйшы.

Ігар Гаеўскі падкрэсліў, што пастанова №666 тычыцца не толькі тавараў легпрама, але ўсіх тавараў, якія могуць нанесці шкоду здароўю чалавека. Адразу пасля прыняцця дакумента быў цэлы шквал зваротаў, працавалі гарачыя лініі, праводзіліся круглыя сталы. Сёння людзі паводзяць сябе спакойна, таму што ўсе зразумелі, для чаго гэта было зроблена.

ДА ВЕДАМА

Паводле інфармацыі прэс-службы Дзяржстандарта, сёння ў краіне дзейнічае дастатковая інфраструктура органаў па сертыфікацыі вырабаў лёгкай прамысловасці (іх 26) і выпрабавальных лабараторый (іх 38). Гэтыя лабараторыі дзейнічаюць не толькі ў сістэме Дзяржстандарта, але і на базе арганізацый Міністэрства аховы здароўя, канцэрна «Беллегпрам», а таксама прыватных арганізацый і структур без ведамаснай падпарадкаванасці. Адзіны рэестр органаў па сертыфікацыі і выпрабавальных лабараторый (цэнтраў) Мытнага саюза можна адшукаць на сайце Дзяржстандарта Беларусі.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Спіс выпрабавальных лабараторый размешчаны на нашым сайце zviazda.by

■

ЁСЦЬ ТАКАЯ ДОБРАЯ ТРАДЫЦЫЯ — ЧЫТАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але ж да нас прыедуць яшчэ і госці больш чым з дваццаці краін свету, зацікаўленыя ў развіцці кнігавыдання спецыялісты, пісьменнікі. А Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш ужо зарэкамендавала сябе як форум з заўжды цікавай, насычанай праграмай, таму да нас едуць з ахвотай і новыя ўдзельнікі. І кожная краіна імкнецца прадставіць свае кнігі, сваіх літаратараў як найлепш.

Напрыклад, надзвычай разнастайную праграму падрыхтавалі ганаровыя госці выставы — Рэспубліка Арменія. Як заўсёды, шмат новых выданняў, прэзентацый і сустрэч з пісьменнікамі прывязуць расіяне. Думаю, што ні ўдзельнікам, ні наведвальнікам выставы сумна не будзе. Да таго ж, адны з «галоўных герояў» мерапрыемства — кнігі, а яны дакладна будуць новыя, прычым найлепшыя.

— Тое, што сёлета ганаровым госцем выставы-кірмашу будзе Арменія, напэўна, дазволіць наладзіць больш шчыльныя і плённыя кантакты кнігавыдаўцоў на прасторы ЕАЭС?

— Адразу хачу заўважыць, што кантакты кнігавыдаўцоў на прасторы ЕАЭС даўно шчыльныя і плённыя. Перш за ўсё маюцца на ўвазе стасункі з Расіяй, можна сказаць, што ў нас фактычна агульная кніжная прастора. Больш за 50% беларускага кніжнага гадлю — гэта кнігі, якія выдаюцца ў Расіі. І гэта нармальна, бо ў нас агульнаславянскія падыходы і традыцыі да кнігавыдання, руская мова — адна з дзяржаўных у Беларусі, у нас ужо склалася агульная культурная, гуманітарная прастора... Тут трэба заўважыць, што сёлета адзначаецца 25 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, і мы імкнуліся, каб на выставе на асобнай тэматычнай пляцоўцы найбольш поўна і разнастайна былі прадстаўлены выданні краін СНД. Разам з тым мы надзвычай зацікаўленыя, каб і наша беларуская кніга была годна прадстаўлена і ў Расіі з яе вялізным рынкам, і ў іншых краінах і ЕАЭС, і СНД. Тым больш што гэта якраз тая задача, якая ў апошнія гады вельмі плённа вырашаецца дзякуючы канкрэтным цесным кантактам, якія нашы выдавецтвы (і Выдавецкі дом «Звязда», і «Мастацкая літаратура», і іншыя) наладзілі з калегамі суседніх краін праз міжнародныя форумы, праз традыцыйны «круглы стол» «Сугучча», які праводзіцца падчас Дня беларускага пісьменства, праз міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і час», які ўпершыню адбыўся ў межах леташняй Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу, а на сёлетняй збярэцца зноў і, спадзяюся, таксама стане добрай традыцыяй.

— Летась падчас сімпозіума пісьменнікі з розных краін разважалі пра грамадзянскую адказнасць носьбітаў публічнага слова, у тым ліку і мастацкага. Дыялог на гэту па-ранейшаму актуальную тэму і сёлета будзе працягнуты?

— У нейкай ступені — несумненна, бо нельга, збіраючы на адной пляцоўцы вядомых пісьменнікаў, не абмяркоўваць шырока пытанні, якія ставіць перад намі час. Але сёлета ўвага будзе скіраваная менавіта на маладых, і тэма дыскусіі падчас сімпозіума — «Пераемнасць у літаратуры». Мы адмыслова да гэтага сімпозіума прымеркавалі семінар маладых літаратараў, на які запрасілі і маладых пісьменнікаў з Расіі. Але для нас найперш важна, каб менавіта нашы, беларускія аўтары, якія толькі пачынаюць свой творчы шлях, мелі досвед, што ўяўляе сабой літаратурная прастора Беларусі, як дзяржава падтрымлівае выданні, як працуе наша кнігадрукаванне, літаратурная перыёдыка. І самае галоўнае, каб яны адчувалі, што ў дзяржавы ёсць вялікі клопат пра развіццё нацыянальнай літаратуры і зацікаўленасць у ім. Таму на семінары адбудзецца прэзентацыя новага творчага конкурсу для маладых літаратараў, які якраз ладзіцца пры ўдзеле Выдавецкага дома «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура», дзеля таго, каб найлепшыя творы маладых аўтараў на працягу года былі ў шырокім грамадскім абмеркаванні. І каб надалей кожны год на кніжнай выставе мы прадстаўлялі найлепшую кнігу маладога аўтара. Трэба гадаваць новую, маладую літаратуру.

— Адной са знакавых падзей сёлетняй выставы-кірмашу стане 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Ці можна сказаць, што гэтым самым будзе дадзены старт падрыхтоўцы такой значнай для краіны даты?

— Актыўна працаваць з гэтай датай мы пачалі ў Шчучыне на Дні беларускага пісьменства, тэма 500-годдзя беларускага кнігадрукавання гучала і на Калядным кніжным балі ў межах акцыі «Сямейнае чытанне». Выдавецтвы ўжо актыўна працуюць над стварэннем тэматычнай кніжнай прадукцыі, Нацыянальная бібліятэка рыхтуе серыю «Скарыніяна». А цяпер усе дзяржаўныя органы кіравання падтрымалі прапанову Міністэрства інфармацыі аб тым, каб надаць падрыхтоўцы да знакавага юбілею дзяржаўны ўзровень. Самае галоўнае — каб гэта было не кампанейшчынай, а сістэмнай працай. Гэты юбілей павінен стаць досведам і гонарам не толькі беларусаў, а ўсіх, для каго кніга з'яўляецца крыніцай ведаў і сімвалам духоўнасці. Мы будзем працаваць над тым, каб не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі была праведзена падрыхтоўчая і арганізацыйная работа. Бо гэта зварот да нашых моцных духоўных каранёў, якія ў сучасным зменлівым свеце для кожнага народа вельмі важныя.

— На нядаўняй калегіі Мінінфарма вы паставілі перад СМІ задачу — працаваць у кірунку канвергенцыі кантэнту, гэта значыць, быць актыўнымі ў інтэрнэце, у сацыяльных сетках. Наколькі рэальна адрасаваць гэтыя патрабаванні кнігавыдавецкай галіне?

— Тут хутчэй трэба казаць не пра кнігавыданне, а кнігачытанне. Бо кнігавыдавецкі працэс — гэта найперш паліграфічныя тэхналогіі. А каб кніга не толькі ў паліграфічным, але і ў іншым — электронным, мультымедыйным увасабленні знайшла свайго чытача — вось што сёння актуальна. Вельмі важна звярнуць увагу на падобнае ўвасабленне дзіцячай літаратуры. Малыя з задавальненнем слухаюць аўдыякнігі, глядзяць іх візуальнае суправаджэнне на гаджэтах... І наша задача на бліжэйшыя пяць гадоў — падысці да стварэння мультымедыйных беларускіх кніг сваіх, беларускіх, аўтараў. Гэта вялікі працаёмкі працэс. Мы пакуль у пачатку гэтага шляху, але ж дарогу адолее той, хто ідзе.

— У межах выставы-кірмашу будуць экспанавацца найлепшыя выданні, якія пабачылі свет з часу папярэдняй выставы. Ці ёсць сярод іх тыя, якія міністр інфармацыі захацела б мець у хатняй бібліятэцы і параіла б займець іншым чытачам?

— Не тое што «захацела б» — яны ў мяне ўжо ёсць. Напрыклад, кніга, якая выйшла ў «Мастацкай літаратуры», — «Уладзімір Мулявін. І сэрцам, і думамі». З задавальненнем пакладу на паліцу ў хатняй бібліятэцы «Беларускі народны касцюм» (кніга пабачыла свет у выдавецтве «Беларуская навука»). З задавальненнем звярнуся да кнігі «Перазвон Белай Русі: тысячагоддзе традыцыі». І ўжо хутчэй для бібліятэкі кіраўніка набуду кнігу «Фінансавая дыета» пад рэдакцыяй Кірыла Рудага, памочніка Прэзідэнта па эканамічных пытаннях, і кнігу Міхаіла Мясніковіча «Эвалюцыйныя трансфармацыі ў эканоміцы Беларусі»... Наогул, я лічу вельмі важным, каб у кіраўніка была хоць невялікая бібліятэка ў працоўным кабінеце і, безумоўна, вельмі хочацца, каб традыцыя мець у кватэры ці доме сваю бібліятэку вярнулася ў нашы сем'і.

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.

■ Напярэдадні падзеі

ТАМ ПАЧЫНАЕЦЦА ІХ ШЛЯХ ДА ПЕРАМОГ

Наша дэлегацыя на днях адправіцца ў нарвежскі Лілехамер

Менавіта гэты горад з 12 па 21 лютага будзе прымаць Другія зімовыя юнацкія Алімпійскія гульні. Сярод удзельнікаў больш за тысячу атлетаў ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў, яны прадставяць 70 краін свету і будуць змагацца за ўзнагароды па 15 відах спорту.

Гульні ў Лілехамеры пройдуць на спартыўных аб'ектах, якія ў 1994-м прымалі «белую» Алімпіяду, дарэчы, менавіта гэты старт стаў першым для Беларусі, дзе наша краіна выступіла самастойнай камандай на зімовых Алімпійскіх гульнях. Тады беларускімі спартсменамі было заваявана два сярэбраныя медалі, іх уладальнікамі сталі біятланістка Святлана Парамыгіна і канькабежац Ігар Жалязоўскі. Невыпадкова, што менавіта Святлана напярэдадні сказала вельмі важныя словы на дарогу маладым беларускім алімпійцам. Вядомая спартсменка пажадала нашым хлопцам і дзяўчатам поспехаў і добрых выступленняў у Нарвегіі.

У Лілехамер адправяцца 16 беларускіх спартсменаў — 8 юнакоў і 8 дзяўчат, яны прымуць удзел у



Фота БЕЛТА.

спаборніцтвах па 7 відах спорту (біятлон, гарналыжны спорт, лыжныя гонкі, хуткасны бег на каньках, сноўборд — слоуп-стайл, фігурнае катанне (танцы на лёдзе), хакей з шайбай (індывідуальнае майстэрства).

Талісманам беларускай спартыўнай дэлегацыі стане Агрык. Падчас урачыстай цырымоніі провадаў беларускай спартыўнай дэлегацыі ў Нарвегію намеснік старшыні праўлення Белаграпрамбанка Сяргей Чугай уручыў першаму віцэ-прэзідэнту НАК Максіму Рыжанкову сімвалічную мяккую цацку, якая будзе і ў кожнага беларускага спартсмена.

Акрамя спаборніцкай праграмы арганізатарамі Гульняў распрацаваны і шэраг інтэрактыўных мерапрыемстваў, падчас якіх спартсмены атрымаюць магчымасць даведацца пра алімпійскія каштоўнасці, вывучыць іншыя культуры і развіць навыкі, каб стаць сапраўднымі пасламі спорту. Бо галоўнай ідэяй падобных спаборніцтваў з'яўляецца атрыманне маладымі атлетамі ўнікальнага вопыту выступлення на міжнародных спаборніцтвах, а таксама магчымасць зносін са сваімі аднагодкамі. Важна, каб хлопцы і дзяўчаты прасякнуліся духам алімпійскай салідарнасці, дружбы і ўзаемнай павагі.

Нагадаем, на І зімовых юнацкіх Алімпійскіх гульнях у Інсбруку (Аўстрыя) Беларусь прадстаўлялі 16 атлетаў у 8 відах спорту. У неафіцыйным медальным заліку наша краіна заняла 24-е месца, заваяваўшы 2 медалі: 1 залаты і 1 сярэбраны. Фігурысты Яўгенія Ткачэнка і Юрый Гуліцкі занялі першае месца ў змяшанай камандзе, «серабро» заваяваў канькабежац Раман Дубовік.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■

■ Факт

БЯСПЕКА ПЕШАХОДАЎ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Новы пешаходны пераход, металічныя агароджы побач з праезнай часткай, а таксама яшчэ адзін святлафор установяць сёлета ў Партызанскім раёне сталіцы.
Гэтыя і многія іншыя мерапрыемствы плануе рэалізаваць раённая Дзяржаўтаінспекцыя ў мэтах арганізацыі бяспекі дарожнага руху.

— Як паказала статыстыка дарожных аварый мінулага года, на тэрыторыі раёна найбольш шматлікай катэгорыяй ДТЗ сталі наезды на пешаходаў. У сувязі з гэтым змены ў арганізацыі дарожнага руху сёлета будуць датычыць у асноўным менавіта іх бяспечнага перамяшчэння, — расказала **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.**

Так, у мікрараёне Сляпянка з'явіцца нерэгулюемы пешаходны пераход. А побач з ім дарожнікі абсталююць дзве штучныя няроўнасці. Гэта дазволіць пешым удзельнікам быць больш абароненымі на дарозе, а таксама выключыць наўмыснае парушэнне імі Правіл дарожнага руху. Сёлета таксама будзе прадоўжана практыка ўстаноўкі на ажыўленых вуліцах металічных агароджаў, якія будуць ахоўваць праезную частку ад нядбайных пешаходаў.

Акрамя ўсяго іншага, у планах раённай Дзяржаўтаінспекцыі значыцца ўладкаванне святлафорным аб'ектам скрыжавання вуліцы Ваўпшасава з Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогай. Электронны рэгуліроўшчык павінен мінімізаваць заторы пры ўездзе ў горад і выездзе з яго.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:
- квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 4285928, 4282147, 8688341;
- полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ №№ 1464170, 1464172, 1158878, 1322501, 1322532, 1322533, 1032496, 1278796, 1278811, 1365482, 1365495, 1365496, 1365506, 1365507, 1365508, 1365509, 1365511, 1427619, 1461740.
УНП 100782388

Утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» формы 1-су серии СВ-№0159442, 0159443, 0159444 **считать недействительными.**

УНП 500013881
Организатор аукциона, который состоится **11 февраля 2016 года в 13.30** по адресу: 230001, г. Гродно, ул. Сокольская, 62, в соответствии **с извещением о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Гродноопторг»**, *опубликованном в газете «Звязда» 27.01.2016 г. № 15 (28125),* продлевает срок приема подачи заявлений **с 05 февраля по 10 февраля 2016 года** включительно.

ГАТОВЫ ДА ЎЗАЕМНАЙ ПАДТРЫМКІ

Нашу краіну наведалі прадстаўнікі найбуйнейшай еўрапейскай арганізацыі ў сферы судовай экспертызы ENFSI

Ян дэ Кіндар, старшыня ENFSI, генеральны дырэктар Нацыянальнага інстытута крыміналістыкі і крыміналогіі Бельгіі, адзначыў, што супрацоўніцтва з Беларуссю для еўрапейскіх судовых экспертаў даволі важнае, і арганізацыя гатова прадаставіць беларускім калегам сваю падтрымку і разгледзець пытанне прыняцця нашай краіны ў свае шэрагі.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Андрэй Швед паведаміў, што беларускі бок гатовы дапамагаць замежным калегам інфармацыяй, напрыклад, у барацьбе з наркотыкамі. Так званыя «дызайнерскія» наркотыкі ў Еўрасаюз часцяком паступаюць з усходу, і Беларусь атрымлівае інфармацыю пра іх значна раней, чым еўрапейскія калегі. У Дзяржкамітэце адзначылі, што наша судова-экспертнае ведамства таксама зацікаўлена ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва як з еўрапейскай арганізацыяй, так і з асобнымі еўрапейскімі ўстановамі.

Што цікава, сустрэча мусіла адбыцца ў Лондане, але па ініцыятыве ENFSI, якая аб'ядноўвае 64 экспертныя ўстановы ў 36 краінах, яе перанеслі ў сталіцу Беларусі.

Якаў ЖУРБІН. *taras@zviazda.by*

«МЫ БУДЗЕМ І ДАЛЕЙ СТУКАЦЦА ВА ЎСЕ ДЗВЕРЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прафсаюз накіроўваў у Міністэрства адукацыі свае прапановы па актуальных пытаннях аплаты працы работнікаў галіны, па сацыяльным пакеце для работнікаў сістэмы адукацыі — з улікам вопыту як асобных арганізацый нашай галіны, так і замежнага, па новай галіновай сістэме аплаты працы, па нарматыве падушавога фінансавання, па даплатах да ўзроўню мінімальнай заработнай платы для асобных катэгорый работнікаў.

Калі праглядаўся парадак атэстацыі педагагічных работнікаў, мы настойвалі на дыферэнцыяваным павелічэнні памераў надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі — каб заробак напрамую залежаў ад кваліфікацыі педагога і каб у яго быў стымул для прафесійнага росту. Гэтая пазіцыя была падтрымана Міністэрствам адукацыі, бо такое рашэнне спрыяе адначасова і павышэнню якасці адукацыі. Надбаўка за другую кваліфікацыйную катэгорыю павялічылася з 15 да 30%, за першую — з 20 да 55%, за вышэйшую катэгорыю — з 30 да 90%, а за катэгорыю настаўнік-метадыст — з 40 да 120%.

Пазіцыя губернатараў істотна адбіваецца на сітуацыі ў галіне. Дастаткова паглядзець на разрыў ва ўзроўні сярэднямесячнага заробку работнікаў сістэмы адукацыі, якія працуюць у розных рэгіёнах.

Разам з тым, вымушаны канстатаваць, што дамагацца росту рэальнай заработнай платы становіцца ўсё больш складана, асабліва з улікам цяперашняй эканамічнай сітуацыі і ў нашай краіне, і ў свеце. Гэта тычыцца ўсіх прадстаўнікоў бюджэтнай сферы. Апошнім часам назіралася зніжэнне тэмпаў росту як намінальнай, так і рэальнай заработнай платы работнікаў галіны. Рэальны рост заработнай платы не пакрывае рост цэн на тавары і паслугі.

Тым не менш мы ўсе цудоўна разумеем, што сацыяльны статус работнікаў устаноў адукацыі павінен адпавядаць іх інтэлектуальнаму патэнцыялу, а работа і намаганні павінны годна аплачвацца. Лічым, што пры ўсіх цяжкасцях у бюджэтнай палітыцы пытанне з заробкамі педагогаў немагчыма вырашыць якасна без накіравання на гэтыя мэты дадатковых бюджэтных асігнаванняў...

Віцебскі «феномен»

— У бліжэйшы час будзе падпісана новае галіновае Пагадненне паміж прафсаюзам і Міністэрствам адукацыі на 2016—2019 гады. Як вы ацэньваеце канструктыўнасць сацыяльнага дыялогу ў галіне?

— Тэрмін «сацыяльнае партнёрства» , якім сёння прынята называць узаемадзеянне ўлады і прафесійных саюзаў, — не проста гучнае азначэнне, а добра адпрацаваная практыка сумеснага вырашэння многіх актуальных пытанняў. У нас атрымалася, напрыклад, вырашыць на карысць работнікаў галіны пытанні з тыпавымі штатамі і нарматывамі колькасці работнікаў устаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Дзякуючы сумесным намаганням Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Міністэрства адукацыі і галіновага прафсаюза работнікам устаноў дашкольнай адукацыі вярнулі ранейшую працягласць адпачынкаў. Увогуле, многія ініцыятывы мы вылучаем сумесна з міністэрствам. Стабілізавалася і сітуацыя са своечасовай выплатай заробкаў і адпускных у тэрміны, устаноўленыя калектыўнымі дагаворамі, у тым ліку ў перыяд летняй адпускной кампаніі.

Мушу канстатаваць, што пазіцыя губернатараў істотна адбіваецца на сітуацыі ў галіне. Дастаткова паглядзець на разрыў ва ўзроўні сярэднямесячнага заробку работнікаў сістэмы адукацыі, якія працуюць у розных рэгіёнах. Апошняе сумеснае пасяджэнне Прэзідыума ЦК і профільнай камісіі дэпутатаў Нацыянальнага сходу мы невыпадкова правялі на Віцебшчыне. Калі ў цэлым па краіне заробак педагагічных работнікаў ніжэйшы за сярэдні, то ў Віцебскай вобласці — наадварот. За студзень—верасень мінулага года сярэднямесячны заробак настаўнікаў у гэтым рэгіёне перавысіў 6 мільёнаў рублёў, гэта 103,7 працэнта да сярэднямесячнага заробку па вобласці і 104,6% да сярэднямесячнага заробку настаўнікаў па краіне. Па Беларусі — самы высокі паказчык!

— І як жа ўдалося дамагчыся росту заробкаў у няпростых эканамічных умовах?

Пераможца гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі — 2015» у намінацыі «Мы — маладыя!» настаўнік гісторыі СШ №199 Яўген СІТКО.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

— Калегі ахвотна падзяліліся сваім «сакрэтам». Высветлілася, што магчымасці для павелічэння заробку з'явіліся, дзякуючы Прэзідэнцкаму Дэкрэту №29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны». Напэўна, іншыя кіруючыя работнікі проста не ўніклі ва ўсе яго нюансы... Заробак, вядома, павышаецца і пры праходжанні педагогамі атэстацыі на першую і вышэйшую кваліфікацыйныя катэгорыі. Цяпер у Віцебскай вобласці ўжо 79,5% настаўнікаў маюць гэтыя катэгорыі (самы высокі паказчык па краіне). Грошы, якія застаюцца пасля рэарганізацыі і рэструктурызацыі сістэмы адукацыі, таксама накіроўваюцца на павелічэнне заробку...

Пра выніковасць працы па сацыяльнай падтрымцы педагагічных работнікаў сведчыць і паказчык замацавання маладых спецыялістаў на першым працоўным месцы: па Віцебскай вобласці ён складае 69,3%. А ў асобных рэгіёнах яшчэ вышэйшы: у Расонскім — 87%, Аршанскім — 79%, Глыбоцкім — 78,5%, Браслаўскім — 74%, Чашніцкім — 73%.

У ліку мер матэрыяльнага стымулявання па папярэджванні адтоку кадраў за кошт мясцовага бюджэту ўстаноўлены надбаўкі ўсім маладым спецыялістам у памеры не менш як 10% ад службовага акладу, прадастаўляецца дадатковы заахвочвальны водпуск, аказваецца садзейнічанне ў атрыманні крэдытаў на набыццё мэблі, бытавой тэхнікі, прадметаў першай неабходнасці. За 2011-2015 гады пры садзейнічанні раённых і сельскіх выканаўчых камітэтаў для пражывання маладых спецыялістаў сістэмы адукацыі выдзелена 85 дамоў, 165 кватэр і прадастаўлена 368 месцаў у інтэрнатах.

Недасягальная прафесійная пенсія

— А што, на вашу думку, мог бы ўключаць сацыяльны пакет педагога?

— Нашы прапановы закранаюць мноства кірункаў, у тым ліку пенсійнае забеспячэнне педагогаў, медыцынскае абслугоўванне, санаторна-курортнае лячэнне, камунальныя плацяжы, ільготныя ўмовы крэдытавання будаўніцтва жылля, кампенсацыі педагогам іх выдаткаў на праезд, гарантыі ў сферы адукацыі, заахвочванне высокіх прафесійных дасягненняў, зніжкі пры наведванні культурна-гістарычных і фізкультурна-спартыўных аб'ектаў, устанаўленне для педагогаў ільготных тарыфаў на мабільную сувязь і доступ у інтэрнэт. Не забыліся мы і пра асветніцкі кірунак — патанненне метадычнай, навуковай і мастацкай літаратуры і ўвядзенне для работнікаў галіны асобных тарыфаў пры падпісцы на перыядычныя выданні. Важна разумець, што заробак — толькі адзін з элементаў працоўных адносін, што, павялічваючы зарплату, трэба думаць і пра ўсё астатняе — пра сістэму атэстацыі, умовы для далейшага асобаснага і прафесійнага росту педагогаў.

— Педагогі скардзяцца, што яны сёння ў адказе за ўсё: за выхаванне (бо сям'я адышла на другі план), за акты абследавання жыллёва-бытавых умоў і тэхнічнага стану кватэр, за наяўнасць пажарных апавяшчальнікаў, стан электраправодкі, падашкавыя памяшканні, печы, коміны і г.д. Гэта праблема не замоўчваецца, але тым не менш яна і не вырашаецца...

— Вы не згадалі яшчэ і пра празмерны дакументаабарот: зменшыць папяровую валакіту пакуль, на жаль, не ўдаецца. Шкада, што наш Кодэкс аб адукацыі не ўтрымлівае норму, якая забараняла б адцягванне педагагічных і навукова-педагагічных работнікаў ад выканання іх непасрэдных прафесійных абавязкаў.

Я ўпэўнены, што ў поўнай меры адказваць за выхаванне сваіх дзяцей павінны бацькі, а не класныя кіраўнікі, настаўнікі і дырэктары. Школа павінна не замяняць бацькоўскія функцыі, а толькі іх дапаўняць. Педагогі скардзяцца, што стаўленне бацькоў да іх у асноўным патрабавальнае, асабліва да маладых спецыялістаў, і нават спажывецкае.

Надбаўка за другую кваліфікацыйную катэгорыю павялічылася з 15 да 30%, за першую — з 20 да 55%, за вышэйшую катэгорыю — з 30 да 90%, а за катэгорыю настаўнік-метадыст — з 40 да 120%.

Большасць беларускіх настаўнікаў працуюць без выхадных: пяць дзён — урокі, у суботу — арганізацыя шостага школьнага дня, а ў нядзелю трэба правяраць сшыткі і пісаць планы. І калі адпачываць? А калі ёсць сям'я, праблемы са здароўем? Наша Мінская гарадская арганізацыя прафсаюзаў праводзіла некалькі гадоў таму маніторынг працоўнага часу настаўніка, і высветлілася, што занятасць настаўніка складае ў сярэднім 9,5 гадзіны на суткі. Пры пяцідзённым вучэбным тыдні гэта каля 48 гадзін. Разам з тым настаўнікам быццам бы ўстаноўлена скарочаная працягласць працоўнага часу — не больш як 36 гадзін на тыдзень!

— А ці ўдалося вам вырашыць пытанне з пенсійным страхаваннем педагагічных работнікаў?

— Мысляр пачатку XX стагоддзя прафесар Васіль Зянькоўскі лічыў, што настаўніку нельга працаваць больш за 15 гадоў, паколькі, акрамя стомы, у яго яшчэ выпрацоўваюцца «нерухомасць, коснасць, імкненне спыніцца на шаблоне». І гэта было сказана задоўга да з'яўлення папулярнай цяпер тэорыі псіхалагічнага выгарання прадстаўнікоў розных прафесій, перш за ўсё педагогаў. А сёння і з 25-гадовым педагагічным стажам на датэрміновую прафесійную пенсію могуць выйсці толькі адзінкі, бо ўсе астатнія не адпавядаюць устаноўленым крытэрыям.

У 2015 годзе мы атрымалі ад Міністэрства адукацыі праект пастановы Савета Міністраў «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у пастанову «Аб некаторых пытаннях прафесійнага пенсійнага страхавання». Чарговы раз выказалі свае заўвагі і прапановы аб неабходнасці перагляду крытэрыяў ацэнкі ўмоў працы асобных катэгорый педагагічных работнікаў для мэт прафесійнага пенсійнага страхавання.

Лічым, што магчымасцю датэрміновага выхаду на пенсію маглі б скарыстацца і педагогі перадпенсійнага ўзросту з сельскіх школ, якія былі закрытыя або рэарганізаваныя. Права датэрміновага выхаду на пенсію дае ўпэўненасць педагогу ў заўтрашнім дні, у тым, што ў выпадку хваробы ці іншых абставін настаўнік зможа выкарыстаць яго і не застанецца без сродкаў да існавання. Гэта важная матывацыя і для маладых настаўнікаў.

Выхавальнікі без катэгорыі

— Якія яшчэ праблемы патрабуюць свайго вырашэння?

— Не вырашана пытанне з аплатай працы педагогаў, якіх задзейнічаюць у падвозе дзяцей у школы. Для прыкладу, толькі ў Мінскай вобласці штодня дзяцей суправаджаюць па дарозе ў школу каля тысячы педагогаў. Сельскаму настаўніку даводзіцца ўставаць а пятай гадзіне раніцы, ехаць збіраць дзяцей па навакольных вёсках і несці за іх адказнасць Але аплата іх працы дзейным заканадаўствам не прадугледжана. Абсалютную большасць работнікаў школ складаюць жанчыны. Прычым многія з іх выхоўваюць сваіх дзяцей у адзіночку. Чаму маці павінна кідаць раніцай сваё дзіця, каб суправаджаць вучняў да школы?

Застаюцца і пытанні з атэстацыяй педагогаў дашкольнай адукацыі. Парадокс сітуацыі заключаецца ў наступным. Калі настаўнік з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй прыйдзе працаваць у дзіцячы садок, ён пазбавіцца даплаты за сваю кваліфікацыйную катэгорыю. Больш за тое, ён не зможа прэтэндаваць нават на другую кваліфікацыйную катэгорыю, таму што не мае адукацыі па профілі «педагогіка дзяцінства». А вось калі педагог з дашкольнай установы прыйдзе працаваць у школу, то яго катэгорыя за ім захаваецца. Для таго, каб ліквідаваць гэты парадокс, ніякіх дадатковых фінансавых сродкаў не патрабуецца.

Многіх хвалюе пытанне завяршэння будаўніцтва гасцініцы каля цырка, якую планавалася здаць яшчэ да чэмпіянату свету па хакеі два гады таму. Аднак пакуль, па словах Андрэя Шорца, добрых навін не чуваць. «Сродкаў на тое, каб дабудаваць аб'ект, у інвестара няма. А з іншымі кампаніямі, нягледзячы на шэраг перамоў на розных узроўнях, пакуль канкрэтных дамоўленасцяў няма», — паведаміў старшыня Мінгарвыканкама.

Пра садкі, паліклінікі і паркоўкі

Па словах Андрэя Шорца, у бліжэйшыя некалькі гадоў у Мінску знікне праблема недахопу дзіцячых садкоў і паліклінік. Да 2020 года ў буйных жылых мікрараёнах сталіцы павінны пабудаваць 15 дзіцячых дашкольных устаноў. Тры дзіцячыя садкі сёлета з'явяцца ў мікрараёнах Міхалова-2, Каменная Горка-3 і жылым квартале «Магістр». Таксама да 2020 года плануецца ўзвесці восем школ (з іх дзве ўжо сёлета: у мікрараёнах Дружба-1 і Масюкоўшчына-3) і столькі ж паліклінік.

У горадзе ёсць яшчэ адна праблема: паркоўкі. Дакладней, празмерная загружанасць аўтамабілямі двароў пры пустых перахопных стаянках у горадзе.

«Нельга пабудаваць каля кожнага пад'езда паркоўку, — заявіў Андрэй Шорац. — У той час, калі ля дамоў у некалькі шэрагаў прыпаркаваны машыны, паркінгі пустуюць. Каб сітуацыя змянілася, неабходна мяняць свядомасць грамадзян».

У цяперашні час прапрацоўваецца пытанне аб увядзенні адказнасці за няплату платнай паркоўкі. Кіраўнік горада паабяцаў, што колькасць платных месцаў для паркоўкі ў цэнтры Мінска будзе расці, і разам з тым будуць закрывацца двары для пабочных машын. Аднак гэта адбудзецца не бліжэйшым часам, бо трэба стварыць неабходную нарматыўна-прававую базу.

Пільная ўвага спорту

Гарадскія сродкі плануецца накіраваць і на будаўніцтва спартыўных аб'ектаў, у прыватнасці, басейнаў. Адзін з іх плануюць пачаць будаваць ужо сёлета. Таксама да канца гэтага лета ў горадзе павінен быць пабудаваны шматпрофільны парк, у якім змогуць практыкавацца прадстаўнікі розных вулічных кірункаў. Сродкі на фінансаванне будаўніцтва гэтага праекта таксама будуць выдзелены з гарадскога бюджэту. Цэнтр размесціцца на вуліцы Сталетава, а ў яго структуры будуць знаходзіцца пляцоўкі для заняткаў воркаутам, паркур-гарадок, скейт-парк, дзіцячыя пляцоўкі з абсталяваннем для фізічнага развіцця. Таксама плануецца ўладкаваць пляцоўкі для заняткаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі, для міні-футбола, стрытбола, брэйк-данса.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Шоу байкераў, нацыянальныя фестывалі і асаблівае свята

Мінчан і гасцей сталіцы сёлета чакаюць як традыцыйныя, так і новыя культурныя мерапрыемствы. Ужо ў красавіку адбудзецца ўрачыстае адкрыццё мотасезона (а ў верасні — закрыццё).

У маі ў Верхнім горадзе адкрыецца летні музычна-турыстычны сезон, які так палюбіўся мінчанам і гасцям сталіцы. А для аматараў актыўнага адпачынку сёлета зноў арганізуюць Мінскі «Polo марафон», хіба што гарадскія ўлады прагназуюць двухразовае павелічэнне яго ўдзельнікаў.

У мінулым годзе разам з грузінскай дыяспарай упершыню правялі свята культуры гэтай краіны «Тбілісоба». Старшыня Мінгарвыканкама прапанаваў усім дыяспарам прыняць удзел у 2016 годзе ў такіх мерапрыемствах і правесці Дні нацыянальных культур. «Цяпер гэта пытанне прапрацоўваецца. Цікавасць ужо праявілі армянская і азербайджанская дыяспары», — паведаміў Андрэй Шорац.

А яшчэ Мінгарвыканкам гатовы разгледзець прапановы гараджан па святкаванні асаблівага дня Мінска.

«Калі атрымаецца арганізаваць такое значнае мерапрыемства, якое прыцягне ў сталіцу вялікую колькасць турыстаў і значна павялічыць паступленне сродкаў у бюджэт ад турыстычнай галіны, то мы заахвоцім аўтараў гэтага праекта каштоўным падарункам», — паабяцаў кіраўнік горада.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

■ Дзівакі

МОРА... ЗА КАНЯ

Прыгажуня і выкладчыца англійскай мовы Яніна з'ехала з Мінска на Полаччыну, дзе знайшла мужа і цяпер разам з ім гадуе коней і поні. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, як маладая сям'я спрабуе наблізіцца да натуральнай гаспадаркі.

ПА СТАЛІЦЫ НЕ СУМУЮЦЬ

Яня і Аляксандр Маслоўскія наўмысна ўцяклі ад цывілізацыі ў вёску Цінаўка Полацкага раёна, каб жыць, як калісьці жылі іх продкі.

— Я нарадзілася ў далёкім Нарыльску. Настолькі холадна там, што, бывае, выходзіш з пад'езда, і першы ўздых абпальвае лёгкія. На Поўначы і мама мая нарадзілася, і цётка, якая першай пераехала ў Мінск — вучыцца. Потым і мы за ёй, — згадвае Яніна.

Паколькі аўтар гэтых радкоў у арміі служыў на Чукотцы, разумелі мы адно аднаго з паўслова. Калі, напрыклад, за вокнамі мінус 40, жыхары Поўначы, як звычайна, ідуць на працу.

Яня, як і цётка ў свой час, спачатку вучылася ў Мінску. Але потым дзяўчына пераехала ў правінцыю, каб працягнуць адукацыю на гісторыка-філалагічным факультэце Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дыплом дазваляе ёй выкладаць і англійскую мову.

— Не хачу зноў у Мінск, — кажа маладая жанчына. — Мне не патрэбны вялікія гарады з мітуснёй. Нядаўна была ў сталіцы, ды яшчэ ў часу пік... Дык хвіліны лічыла, каб хутчэй з'ехаць. Да таго, як перабрацца ў вёску, жыла ў Наваполацку. Там і з будучым мужам пазнаёмілася. Ён наваполацкі. Але яго, як і мяне, заўсёды цягнула да прыроды... Кажуць, у вёсцы сумна. Няпраўда! Тут кожны дзень усё па-рознаму! Конь, напрыклад, уцячэ, куры яйкі знясуць.

Яня з любоўю распавядае пра жывёл, якія жывуць на іх «ферме»: усяго ў гаспадарцы чатыры кані, у тым ліку адзін маленькі, два поні, сем курэй, тры гусі (якія сваім гагаканнем перашкаджалі нам гутарыць), чатыры казы, лебедзь... А яшчэ двое кацянят і чатыры сабакі.

ВЫРАТАВАЛА АД МЯСАКАМБІНАТА

— Вось таго каня хацелі з гаспадаркі, дзе ён жыў, на мясакамбінат здаць. Яму яшчэ і года не было. Я тады вучылася на другім курсе ўніверсітэта. Збірала грошы, каб на моры адпачыць. Калі даведалася пра каня, выратавала яго купіць. Зразумела, не ў кватэры жыў *(смяецца)*, у знаёмых маіх у вёсцы. А той, што побач — яго брат. Купіла ў цыганоў, — паказвае жывёл Яніна.

Былая гараджанка падрабязна расказвае пра пароды і характар сваіх хвастатых гадаванцаў. Раптам да маіх ног нехта далікатна дакранаецца. Казёл па мянушцы Пушкін такім чынам праявіў інтарэс. Гаспадары тут жа пагаджаюцца, што на рускага паэта знешне падобен журналіст «Звязды», і далей са смехам назіраюць знаёмства двух «пушкіных».

Коні маладой сям'і прыбытак пакуль не прыносяць: і турыстаў, і мясцовую дзятву Маслоўскія катаюць задарма.

— Адзінае, просім людзей трохі дапамагчы па гаспадарцы. Не хапае рук з усім самім справіцца. Ніяк нармальнае навасёлле не справім. Дом пабудавалі мае бацькі. Мы ферму ніяк не дабудуем, — перажывае Яня.

Падчас фотасесіі для газеты конь, якога Яня і Саша МАСЛОЎСКІЯ выбралі ў якасці мадэлі, літаральна ўсміхаўся. Асабіста я такога раней не бачыў.

Нягледзячы на складанасці, маладыя поўныя аптымізму. Коні ім замяняюць і трактар, і газонакасілку...

— У мяне і суседзі просяць «капытны апарат» у арэнду: газоны даглядаць, — кажа Яня.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Саша пакуль працуе на «Нафтане» машыністам кампрэсарнай установкі. Пажартаваў, што нават у карпаратыўнай газеце яшчэ не ведаюць, што ён і яго жонка — «пустэльнікі». Яго продкі з Украіны.

— У нашай сям'і ўвасобілася дружба народаў. Я — напалову ўкраінец, напалову паляк. Жонка — беларуска, але нарадзілася ў Расіі. Дзед мой падчас вайны быў у адным партызанскім атрадзе з Машэравым. Служыў у дэсантных войсках... У Беларусі ён пазнаёміўся з бабуляй. Тут мама мая нарадзілася, — дапаўняе сямейную гісторыю Саша.

У двары Маслоўскіх стаіць зламаны аўтамабіль. Галава сям'і ездзіць на працу на аўтобусе, потым доўга дабіраецца пешшу. Ён марыць пра тое, каб уласная ферма дазволіла яму цалкам пераключыцца на працу на зямлі.

— На маім прадпрыемстве добры калектыў і заробак. Даплачваюць за вытворчую шкоднасць. А мне хочацца дыхаць чыстым паветрам, — разважае Саша.

Ён не ўжывае спіртнога, не курыць. Любіць мяса, але сваіх жывёл есці Маслоўскія не збіраюцца.

«ПЕДЫКЮР»... КОНЯМ

Яня паказвае лебедзя з абмежаванымі магчымасцямі. Яго прывезлі рыбакі, каб птушка не загінула ад голаду — у моцныя маразы вадаём, дзе яна жыла, цалкам пакрыўся лёдам.

— Неабыякавыя людзі звярнуліся да эколагаў. Тыя спаслаліся на натуральны адбор. Маўляў, драпежная птушка: калі не выжыве, дык так трэба прыродзе. Але ж шкада, — кажа Яня.

Апроч іншага, Яніна — рамесніца вельмі рэдкай спецыялізацыі. Яна рымар: робіць вупраж, гункі і падобнае.

— А яшчэ расчышчаю капыты ў коней — падтрымліваю іх у анатамічна правільным выглядзе. Па дапамогу звяртаюцца гаспадары іншых коней, якія жывуць недалёка. Акрамя таго, расчышчаю капыты коням з клубаў у Полацку, Баравусе. Езджу дзеля гэтага ў расійскія Себеж, Пскоў, Невель. Часам — у Мінск. Там хапае такіх спецыялістаў... У абласных цэнтрах іх больш, чым на перыферыі. А ў Полацкім раёне я адна, — сціпла тлумачыць Яня.

Гаспадыня сама не ведае, адкуль пра яе даведваюцца ўладальнікі коней. Напэўна, адны адным расказваюць, што ёсць на Полаччыне «эксперт па капытах»...

Пра дзяцей Маслоўскія мараць, але спачатку хочуць моцна стаць на ногі. Каб не прыходзілася думаць, на якія грошы купіць абутак, адзенне малым.

Мы дамовіліся сустрэцца наступным разам улетку. Калі ў іх штодня адбываюцца падзеі, то, пэўна, будзе пра што яшчэ расказаць. Саша з Яняй плануюць, дарэчы, набыць паўночнага аленя і разводзіць індыкоў.

Дарэчы, Маслоўскія хоць і дзівакамі выглядаюць для многіх, але цалкам трапляюць у тэндэнцыю, якая на Захадзе ўсё больш пашыраецца: людзі з гарадоў перабіраюцца ў глуш. Калі назву гэтай «хвалі» дакладна перакласці, атрымліваецца: «пераход у нізы», або «ад складанага да простага».

Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.
pukshanski@zviazda.by
Полацкі раён — Віцебск

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 5 (305)

ЛІТАРАТУРНЫ ПАЧАСТУНАК

Прыемна, што нас чытаюць. Але прыемна і калі нам пішуць. Падчас сустрэчы з пераможцамі конкурсу апавяданняў «Звязды» па выніках 2015 года гэтыя дзве прыемнасці супалі. Да нас прыехалі людзі, якія адначасова вельмі адданыя нашы чытачы і яшчэ добрыя аўтары, чые творы не аднойчы прадстаўляліся ў конкурсе апавяданняў.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Конкурс перажывае новы этап свайго існавання разам з вядучым, пісьменнікам Алесем Бадаком. Ён згадаў розныя часы і адзначыў, што з'яўляецца асноўнай задачай цяпер:

— Мы заўсёды аказваемся закладнікамі часу літаратурнага жыцця. Быў перыяд, калі ў конкурсе «Звязды» прымалі ўдзел нават народныя пісьменнікі Беларусі. Было і такое, калі на конкурс прыходзіла шмат апавяданняў ад чытачоў з самых розных рэгіёнаў Беларусі. Цяпер сітуацыя крыху іншая. Мне здаецца, што асаблівасць конкурсу ў 2015 годзе ў тым, што нашы аўтары працуюць у розных жанрах, у розных стылях (нават калі паглядзець па выніках, то ў пераможцах — гістарычны твор, узнёсла-паэтычны і класічнае апавяданне). Засталося шмат ненадрукаваных твораў самых розных жанраў. Мяне гэта вельмі радуе: таму што насамрэч беларуская літаратура, калі выйсці за межы нашага конкурсу, абсалютна разнастайная.

Само паняцце конкурсу вымагае аднолькавых умоў для ўсіх удзельнікаў, складанасць заключаецца ў тым, што ёсць аўтар, які прыдумаў харошы сюжэт, а ў яго кепская мова. Ёсць аўтар, у якога добрая мова, харошы сюжэт, але стылёва апавяданне патрабуе дапрацоўкі. Другая праблема, якая ёсць у конкурсу, палягае ў тым, што даволі нярпоста працаваць у жанры кароткага апавядання. Чаму мы, бывае, і адступаемся ад прынцыпаў, часам надрукаванае апавяданне выходзіць за межы патрабаванага памеру. Але нашы патрабаванні трымаюць высокую планку найперш у якасным складніку.

Алесь Бадак лічыць: тое, што з'яўляецца на старонках «Звязды», можна назваць літаратурай — паступова ад «народнага конкурсу» (якім лічылі яго крыху раней) мы перайшлі да літаратуры, каб друкавалася больш разнастайных твораў у жанравым плане.

Лаўрэат Першай прэміі (за апавяданне «Таямніца Фары Вітаўта») Віктар ВАРАНЕЦ працуе ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце намеснікам дэкана медыка-псіхалагічнага факультэта па выхаваўчай працы. Як філолаг і выкладчык ён дапамагае студэнтам-медыкам засвоіць прафесійную лексіку на беларускай мове. Але прызнаецца:

— Мне творчасць прыносіць задавальненне. Немагчыма жыць у Гродне і не адчуваць гісторыю. Таму мне асабліва блізкая гістарычная тэма. У нашым універсітэце існуе літаратурнае аб'яднанне «Катарсіс», якім я кірую. Удзельнічаюць у ім студэнты. Адзін з галоўных аргументаў, каб яны пісалі па-беларуску — тое, што ў «Звяздзе» друкуюцца апавяданні на беларускай мове. Яны бачаць, што ўзровень твораў, надрукаваных у газеце, вельмі высокі. Гэта стымулюе не адыходзіць ад беларускай мовы, далей у жыцці ёю карыстацца. У нас у Гродне я ведаю каля 15-ці дактароў, якія вядуць прыём на беларускай мове.

Андрэй СІДАРЭЙКА, які атрымаў Другую прэмію конкурсу «Звязды» (апавяданне «Велікодны пачастунак»), ідзе ў літаратуру сваім шляхам, які абраў свядома. Пра тое, што будзе пісаць, падумаў гадоў у 10: калі самастойна прачытаў кнігу «Нязнайка на Месяцы» Носава — захацелася ствараць свае сусветы. Дарослыя думалі, што з часам гэтая ідэя выйдзе з галавы. Андрэй скончыў педвучылішча, вывучыўся на настаўніка пачатковых класаў, працаваў у школе... Але зрабіў крок да здзяйснення сваёй мары, паступіў у Інстытут журналістыкі БДУ. Працаваў у газеце на Буда-Кашалёўшчыне. І зразумеў, што публіцыстыка — зусім не тое, чым хацеў займацца. Вырашыў усё змяніць. Пераехаў у Мінск, пайшоў працаваць у краму грузчыкам, каб быў час для літаратурнай творчасці. Андрэй Сідарэйка гаворыць:

— Мой літаратурны дэбют адбыўся, калі я яшчэ вучыўся на журфаку. Удзельнічаў у конкурсе «Звязды». Гэта было штуршком: адчуў, што калі твор надрукавалі, то, значыць, я напісаў нешта вартае ўвагі. Гэты конкурс дадаў мне ўпэўненасці ў сабе. Потым друкаваўся ў «Маладосці», у «Вожыку». Дзякуй пісьменніку Уладзіміру Саламаху, які дапамог парадамі — у выніку і з'явілася гэтае апавяданне. Я не чакаў, што яго так ацэняць — яно асабістае.



Пісьменнік Леанід ЛЕВАНОВІЧ, які атрымаў Трэцюю прэмію нашага конкурсу, герояў свайго апавядання «Дзед Васіль і Орлік» прыгадаў... у Злучаных Штатах Амерыкі. Твор нарадзіўся праз настальгію. Мінулую зіму ён правёў у Амерыцы, дзе ў асноўным займаўся ўнукам. Сам пісьменнік прызнаўся: калі мовы не ведаеш, ёсць адчуванне, што ў іншай краіне, як у клетцы. У адзін прыгожы сонечны дзень успомніў, як ішоў у вёску... З Амерыкі даслаў апавяданне на конкурс па электроннай пошце.

Гэтага аўтара нашы чытачы добра ведаюць, а сам Леанід Левановіч распавёў, як «Звязда» паспрыяла яму ў творчасці:

— Пасля вайны ў нашай новай хаце (старую спалілі немцы), сцены былі абклеены газетамі. Сярод самых розных газет была і «Звязда». Я быў хлопчыкам, і калі мне хацелася чытаць, то станавіўся на табурэтачку і чытаў газеты. Па «Звяздзе» я вучыўся чытаць і спасцігаў жыццё. Пасля Магілёўскага культпрасветвучылішча імя Крупскай адслужыў 3 гады на Балтыйскім флоце. Калі я вярнуўся — ужо членам партыі — мне сказалі, што трэба выпісаць «Звязду». Я выпісаў. І дзякуй «Звяздзе», па якой вучыў фактычна наноў беларускую мову. Вучыўся на журфаку. Першы раз надрукаваўся ў 1962 годзе як журналіст. А потым друкаваў аповесці — «Звязда» некалі змяшчала нават вялікія творы. Але вельмі добра, што і сёння газета не адмаўляецца ад правядзення конкурсу апавяданняў.

І сапраўды, наш конкурс — ужо традыцыя, нехта хоча адчуваць сябе далучаным да яе, як нашы пастаянныя ўдзельнікі. А моладзь разглядае газету як пляцоўку, каб заявіць пра сябе ў літаратуры.

Алесь Бадак падвёў вынік размовы:

— Ужо цяпер можна назваць імёны, якія дзякуючы конкурсу апавяданняў «Звязды» сталі вядомыя ў літаратурным коле. У кожнага ёсць шанц. І надалей хацелася б захаваць разнастайнасць і трымаць высокі ўзровень твораў. Таму запрашаем і творцаў, якія з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў, і аўтараў-пачаткоўцаў з розных куткоў Беларусі дасылаць свае апавяданні.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

БЕЛАРУСКА Ў ПАРЫЖЫ

Валянціна Шоба — пра карціны для любімага і Францыю

Парыж. Павільён «Гран-Пале» ладзіць міжнародную выстаўку на 2 тысячы работ. Беларуская мастачка едзе з карцінай пра вайну. Сярод мноства палотнаў вылучаюць яе «Уладу цемры». За ідэю, якой бракуе сучаснаму мастацтву, творцы з Беларусі прысудзілі прэмію Тэйлара.

МІНСК — ГРОДНА

Валянціна Шоба — гаспадыня славутых Басі і Касі, вежаў у гістарычным цэнтры Гродна. Ідзём да іх у зімовым змроку і адкрываем горад нанова. Цяпер тут бязлюдна, вуліцы агарнуў сон. Шлях да месца працы мастачкі пралягае непадалёк ад майстэрні яе мужа. Уладзімір Панцялееў — выбітны беларускі скульптар. Цёмная лесвіца па небяспечна вузкіх прыступках вядзе на другі паверх, дзе больш як 20 гадоў працуе творца.

Дзяўчынка з мінскай школы-інтэрната для адораных дзяцей адолела складаны шлях да поспеху. Спадарыня Валянціна распавяла:

— Я не паступіла ў тэатральна-мастацкі інстытут у першы год, а на той час было строга: калі не працуеш, то не маеш права трымаць іспыты зноў. Лёс змусіў уладкавацца на працу на завод. Я паважаю людзей, якія прысвяцілі такой карыснай справе ўсё жыццё. Проста гэта не маё! Пасля напружанага працоўнага года дала сабе зарок: «Зраблю ўсё магчымае, але скончу інстытут і больш ніколі ў жыцці не буду так працаваць».

Гэтыя словы сталі прароцкімі.

Валянціна Шоба яшчэ жыла ў Мінску, але ўжо лётала на самалёце ў Гродна, дзе, паводле яе слоў, адметная атмасфера, бо другога такога горада ў Беларусі няма. Захопленая мінуўшчынай краю мастачка і дыпломную работу выканала па рамане Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», і месца для працы па размеркаванні абрала менавіта ў любімым горадзе.

ПАСЛЯ КРЫВАВАЙ ПЯТНІЦЫ

Мастачка распавяла, што падарожжамі захапілася пад уплывам дачкі Ганны. Дачка падштурхнула і прыняць удзел у парыжскай выстаўцы. Ваеннае становішча ачысціла горад. Шмат паліцэйскіх, але гандляроў з маленькімі Эйфелевымі вежамі на дзіва мала. Елісейскія палі ледзь не пустыя...

Таму і на міжнароднай выстаўцы «Art Capital» у «Гран-Пале» гасцей было няшмат. А раней 2 тысячы работ з сарака краін свету перапоўнілі б аматарамі мастацтва і проста цікаўнымі турыстамі знакаміты палац велічынёй з тры футбольныя палі. Гэтая выстаўка ладзіцца з сярэдзіны XX стагоддзя, і менавіта яна робіць Парыж сталіцай мастацтва, пакідаючы за спінай Лондан і Нью-Ёрк. Сам будынак «Гран-Пале» — аднагодак Эйфелевай вежы. Са знакамітай парыжанкай ён і вагу мае аднолькавую — 7300 тон. Маштабны палац на Елісейскіх палях дагэтуль ні разу не сустракаў беларусаў. Але першае спатканне з нашым мастацтвам прайшло на ўра: Валянціна Шоба атрымала прэмію барона Тэйлара.

І хоць сама выстаўка паказвае падкрэслена сучаснае мастацтва, якое амаль заўсёды функцыянальнае, сёлета перамаглі работы іншага роду. Карціна нашай мастачкі «Улада цемры» — гэта не сукупнасць сімпатычных кружочкаў ды квадрацікаў, а найперш ідэя. На палатне 130 на 90 сантыметраў — вайна. Верагодна, работа Валянціны знайшла водгук у французаў, бо сугучная парыжскаму настрою пасля страшнага тэракту.

«ЛЮБІМЫ»

На карцінах Валянціны — містычная прырода, казка, магія, водарасці, жывёлы. А неяк у маляўнічых вобразах мастачка штодзень занатоўвала цэлы год, ствараючы праект «Каляндар», дзе карцін роўна 365. Гэтым здзівіла Беларусь: такога краіна яшчэ не бачыла. Апошні творчы паказ Валянціна Шоба прымеркавала да Калядаў і Новы год сустрэла без пэўных планаў. Чаго жадаць, калі кожны месяц 2015-га прынёс ёй выстаўку, а часам і не адну? Сёння ж мастачку цікавіць магічная сістэма знакаў беларускай арнаментальнай вышыўкі.

У назвах карцін Валянціны Шобы часта сустракаецца слова «любімы». Да яго яна звяртаецца, у яго пытаецца і яму дзякуе. Хто ж ён?

— Гэта пэўны чалавек. Тут маецца на ўвазе не каханы муж, а іншы — мой духоўны бацька, можна сказаць. Ён чалавек з рэлігійным санам, але «любімы», бо дзякуючы яму я перастала баяцца жыць. Як не сказаць, што чалавек любімы, калі дзякуючы яму і ты сябе адчула чалавекам? — усміхаецца мастачка.

Усё жыццё Валянціну Шобу «трымае за руку» Святы Мікалай. Дзіўныя супадзенні адбываюцца ў жыцці мастачкі:

— Усё пачалося даўно-даўно ў Вільнюсе. Школьніцай любіла купіць кветачак і паехаць, куды вочы глядзяць. Памятаю, было дрэнна, уцякла з урокаў, паехала ў Вільнюс. Зайшла ў храм. Упадабала іконку, купіла. Імгненна стала добра. Аказалася, гэта выява Святога Мікалая. На Вялікдзень прыйдзеш у храм і раптам разумееш, што плачаш. Адварочваешся, а за спінай — Святы Мікалай. Паляцела ў Харватыю, а мястэчка выявілася пад яго заступніцтвам, нават вуліца, дзе я жыла, так і называлася. Па жыцці з ім сутыкаюся. Гэта ў галаве.

САКРЭТ

— Мастацтва мае місію: расказаць пра краіну. Я ніколі не з'еду жыць за мяжу, нават калі клікаць будуць моцна туды, дзе мёд, бо без сваёй ракі я проста памру, — прызнаецца мастачка. Валянціна Шоба бачыць радзіму праз фарбы, упэўненая, што колер зямлі, паветра, неба ўсюды розны. Яна верыць у лёс і ведае сакрэт будучыні:

— Можна быць вельмі таленавітым падчас навучання ў школе, а пасля ператварыцца ў бяздомнага. І так здараецца часам. Але ж прафесію ніхто не адбірае. Яна толькі твая. А талент здольны і адпомсціць за абыякавасць гаспадара. Таму надзвычай важна не выпусціць аловак з рук.

Акрамя як працаваць — пісаць карціны, мастачка не імкнецца мець іншыя радасці. Для яе выстаўка — свята. Валянціна Шоба лічыць за лепшае быць сярод карцін.

— Гэта не адзінота! — паўтарае яна. — Столькі карцін! А яны — як дзеці, жывыя.

Зіма, цямнее рана. Валянціна Шоба любіць, калі цёмна: усе спяць, можна працаваць і ціха верыць у цуды.

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

■ Дакументалістыка

ПОЎНЫ МЕТР ЯК ВЫКЛЮЧЭННЕ

Студыя «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» прадставіла фільмы, створаныя за мінулы год. З 17 карцін большасць здымалася ў фармаце трынаццаці хвілін (калі дакладней — 12.59). Але і поўны метр усё ж заявіў пра сябе і ўвасобіўся ў трох стужках, што былі даверaны ўжо масцітым рэжысёрам — Галіне Адамовіч, Віктару Аслюку і Юрыю Гарулёву. Мінулае ў прадстаўленым кантэнце дамінуе, яму і ўвага, і даследаванне, і пэўны піетэт. А вось сучаснасць застаецца недзе ўбаку, недарэмна з'яўляецца шкадаванне таго, што беларуская дакументалістыка аддаецца на карысць рэкламным фільмам, лікбезу і мантажу кінахронікі.

Сярод кароткаметражак ёсць цэлая серыя фільмаў пра замкі Беларусі — Крэўскі, Мірскі, Навагрудскі, Гальшанскі... У гэтым жа сегменце рэалізавана некалькі іншых тэм, напрыклад, партрэт дырыжора і мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Аляксандра Анісімава альбо фільм пра студэнцкі тэатр, аўдыторыяй якога з'яўляюцца хворыя дзеці.

Кожны са створаных поўнаметражных фільмаў летась у якасці кінапраекта перамог у рэспубліканскім конкурсе, дзякуючы чаму атрымаў стапрацэнтнае дзяржаўнае фінансаванне. Вынік з'явіўся даволі хутка.

Прэм'ера карціны «Беларусь. Дакументальная гісторыя» Галіны Адамовіч ужо адбылася некалькі месяцаў таму. Пэўная частка фільма заснавана на хроніцы і работах беларускіх дакументалістаў ад пачатку дзевяностых да сённяшніх дзён. У карціну ўключаны надзвычай фактурныя эпізоды з 90-х гадоў: чэргі на мяжы з Польшчай, у якой беларусы зарабляліі грошы, незадаволены натоўп людзей на плошчы каля помніка Леніну, аповед простых працоўных пра безграшоўе і неабходнасць утрымліваць сям'ю. Тут зафіксаваны час безнадзейнасці і надзеі на будучыню, час сацыяльных узрушэнняў, час гучнага голасу народа, час лёсавырашальных падзей. Усё гэта лагічна перацякае ў аповед пра дасягненні незалежнай краіны — працу завода Гомсельмаш, паспяховую практыку трансплантацыі сэрца, будаўніцтва Беларускай АЭС, пра рэстаўрацыю Архікафедральнага касцёла ў Мінску. Побач з тымі, хто гэтыя поспехі стварае, дакументалісты — яны фіксуюць гісторыю краіны і адшукваюць сапраўдных герояў.

Настаўнік Сяргей Сяргеевіч у атачэнні дзяцей.

Карціна Віктара Аслюка «Педагагічная паэма» па сцэнарыі Вольгі Дашук здымалася ў канцы навучальнага года і пачатку ўжо наступнага. А між тым, героямі фільма з'яўляюцца маладыя настаўнікі Дзмітрый Макарчук і Сяргей Бародзіч, што з'ехалі з Мінска ў аграгарадок Жыліхава Капыльскага раёна, каб працаваць у школе. За час працы над фільмам адзін з педагогаў перайшоў працаваць у іншую школу, да таго ж калегі знайшлі для пражывання прыватны дом замест інтэрната. Вучні, шчыра прывязаныя да сваіх настаўнікаў, дапамагалі ім прыбіраць новае жытло.

Кадр з фільма «Трасцянец. Мы павінны ім памяць».

Усё гэта — побыт, урокі, стасункі з вучнямі, падрыхтоўка да школьнага свята, віншаванні калег, непрацяглыя разважанні — стала жывой і прыемнай фактурай. Па словах сцэнарыста, героі фільма — апантаныя педагогікай, таму тут сапраўдная, не штучная тэма, маляўнічая гісторыя. Адсутнасць выразнага пачатку і канца ў «Педагагічнай паэме» робіць карціну быццам выразаным з кантэксту доўгім эпізодам, без адказаў на неадчэпныя лагічныя пытанні. Гэта бытапісанне. Што само па сабе мае каштоўнасць.

Каштоўнасць карціны «Трасцянец. Мы павінны ім памяць» у жывых людзях, для якіх гэта назва — «Трасцянец» — мае значэнне. Карціна Юрыя Гарулёва зафіксавала тыя водгукі, магчымасць атрымаць якія паступова знікае. Водгукі тых, чые бацькі альбо сваякі падчас Другой сусветнай вайны былі накіраваны ў лагер смерці; тых, хто жыў у вёсцы Малы Трасцянец, тых, хто сёння даследуе гэты гістарычны эпізод.

У Трасцянцы былі забіты людзі з Германіі, Аўстрыі, Польшчы, СССР, сённяшніх Чэхіі і Славакіі, таму і водгукі трагедыі можна шукаць на даволі вялікай тэрытарыяльнай прасторы. Аўтары карціны такой цяжкасці не пабаяліся — фільм змясціў багаты матэрыял, чуллівыя нюансы аповедаў нашчадкаў забітых людзей, аддаў даніну ахвярам нацызму.

Тры поўнаметражныя фільмы для студыі «Летапіс» — гэтага мала. Мала нават для таго, каб даследаваць сучаснасць і пакінуць яе візуалізацыю і эмоцыі будучым пакаленням. А рэчаіснасць тым часам настолькі разнастайная, што самастойна яе не ахапіць, не ўсвядоміць, не прааналізаваць. Творчы азарт кінадакументаліста павінен знаходзіць адпаведную падтрымку. Тады і да памяці мы зможам дакрануцца.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Кінакрокі

ТЭМА АДНА, ФІЛЬМЫ — РОЗНЫЯ

Новая сістэма развіцця маладога кіно дала плён

Тры кароткаметражкі беларускіх маладых аўтараў былі паказаны на вялікім экране ў Мінску як вынік праекта KINOSPRINT. Праект, што быў распачаты летась у Беларусі, накіраваны на ўзаемадзеянне кінаэкспертаў і пакалення маладых кінематаграфістаў. Апошнія падавалі заяўкі, пісалі сцэнарыі, афармлялі каштарысы, праходзілі этапы здымачнага працэсу, працавалі над так званым постпрадакшнам, укладваліся ў тэрміны і графікі, карацей, міналі ўсе «колы пекла» стварэння фільма. А наўзамен атрымлівалі ад арганізатараў конкурсу доступ да тэхнічнага абсталявання і тэарэтычную, кансультацыйную дапамогу.

Пілотны выпуск хоць і зацягнуўся (скончыцца ён павінен быў яшчэ ў кастрычніку), але мэтаў, здаецца, дасягнуў. Тры ігравыя кароткаметражкі папоўнілі пласт сучаснага маладога беларускага кіно і хто ведае — магчыма, удзельнікі конкурсу гэтым не абмяжуюцца.

«Сутнасць праекта была ў тым, каб пачаць перадаваць вопыт, і гэта, на мой погляд, атрымалася. Не істотна, што ў фінале аказаліся толькі тры работы, а не дзесяць — гэта ж толькі першы крок. У выніку мы маем маладое кіно, зробленае на дастаткова высокім узроўні, і тэхнічным, і мастацкім. Што таксама важна — гэта закончаныя работы, а толькі ў гэтым выпадку вопыт мае сілу», — каментуе генеральны прадзюсар «БелФільм Групы» і адзін з «экспертаў» праекта Юрый Ігруша.

Тэмай фільмаў была заяўлена экалогія. Рэжысёр Міхаіл Пархоменка на Кінаспрынце зняў сваю дэбютную карціну — крыху дыдактычную трагікамедыю «Эстафета». Па сюжэце дачнік знаходзіць у сваім агародзе заржавелую бомбу і разгублена спрабуе прыдумаць, што з ёй рабіць. На дапамогу прыходзіць простая логіка: бомба — гэта зброя, а зброю трэба здаваць у міліцыю. Таму галоўны герой кладзе знаходку ў свае «жыгулі» і вязе ў аддзяленне...

Ігар Чышчэня, вядомы сваімі дакументальнымі працамі, — не дэбютант у кіно, але над ігравой карцінай, дзякуючы ўдзелу ў Кінаспрынце, працаваў упершыню.

«Паміж ігравым і дакументальным кіно насамрэч вялікія розніца. Для дакументальных фільмаў патрабуецца меншая здымачная група, меншая колькасць тэхнікі, апроч іншага — гэта інтымная праца. Стварэнне ігравога фільма — іншая справа, тут трэба кіраваць калектывам, арганізоўваць прастору. У першым выпадку ты, можна сказаць, фіксуеш тое, што адбываецца, у другім ты павінен прыдумаць, стварыць, зрабіць матэрыял падобным да тваёй задумы. Вось гэтага вопыту ў мяне да ўдзелу ў праекце не было. Апроч іншага на Кінаспрынце я зразумеў, што добра ўмею, а што ў мяне атрымліваецца дрэнна, вызначыў свае плюсы, мінусы і кірункі, у якіх трэба практыкавацца. Тут мы памацалі матэрыю, так скажам, вялікага кіно», — кажа рэжысёр.

Яго каманда абрала тэму аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Што, дарэчы, актуальна — у краіне савіку споўніцца трыццаць гадоў з моманту выбуху на энергаблоку электрастанцыі. У карціне «Лічыльнік шчасця» хлопчык знаходзіць у рэчах бацькі, які вярнуўся з камандзіроўкі, дзіўны прыбор. Малы прымае яго за вымяральнік узроўню шчасця. Прыбор, што насамрэч з'яўляецца дазіметрам (прызначаным для вымярэння ўзроўню радыяцыі), паказвае і сутнасць камандзіроўкі, і тэму фільма, і прычыну навіслай напружанасці. Дзякуючы аднаму атрыбуту карціне не спатрэбіліся лішнія словы і ўдакладненні.

Дачнік знаходзіць у агародзе заржавелую бомбу і разгублена думае, што з ёй рабіць. На дапамогу прыходзіць простая логіка: бомба — гэта зброя, а зброю трэба здаваць у міліцыю.

Чалавечая гаворка апроч адной фінальнай фразы адсутнічае ў фільме «Дваццацьшаснаццаць», якую супольна знялі Андрэй Крывецкі і Дзмітрый Рачкоўскі. На Зямлі застаецца адзін чалавек, які жыве ва ўмоўным доме, з умоўнымі сценамі і дзвярыма, але абавязкова ўсіх умоўнасцяў прытрымліваецца. У яго ёсць радыёпрыёмнік, запасы правізіі, папера, на якой ён піша лісты, ровар, на якім ездзіць іх адпраўляць. З дакладнасцю мінута ў мінуту. Але радыёпрыёмнік не знаходзіць сігнал, і лісты са скрыні ўжо даўно ніхто не даставаў. У пэўны эмацыянальна крызісны момант галоўны герой знаходзіць паштоўку з выявай горада Дубай і, натхніўшыся ёю, пачынае працаваць над яшчэ адной у сваім жыцці ўмоўнасцю.

Працоўны момант здымачнай групы фільма «Дваццацьшаснаццаць».

З маладымі кінематаграфістамі ў праекце Кінаспрынт працавалі вядомыя дзеячы беларускай кінапрасторы — прадзюсар New wave production Аляксандр Левянчук, сцэнарыст Андрэй Курэйчык, дырэктар Кінашколы-студыі Андрэй Палупанаў, дырэктар rental-кампаніі FIRST RENTAL Сяргей Якубоўскі і іншыя.

Тры ігравыя кароткаметражкі папоўнілі пласт сучаснага маладога беларускага кіно, і хто ведае — магчыма, удзельнікі конкурсу гэтым не абмяжуюцца.

«Я думаю, гэта толькі першы крок у галіне, дзе з маладымі працуюць прафесіяналы. Гэта вельмі важна, таму што дагэтуль у якасці настаўніка выступала па сутнасці толькі дзяржава — у навучальных установах, у фінансаванні дэбютаў. Мы маем справу з маладымі, некіруемымі людзьмі, з тымі, хто сам прыйшоў да цікавасці да кіно. Прафесіяналы пачалі працаваць з удзельнікамі праекта з самага нуля. Гэта было нялёгка: заяўкі падалі дзевяноста чалавек, але толькі тры работы дайшлі да фіналу. Яшчэ 5-6 работ мы страцілі ў працэсе. Цяжка было прымусіць слухаць вопытных людзей, маладым здавалася, што яны ведаюць усё. Але тыя, хто дайшоў да фіналу, набіўшы гузакоў, зразумелі, што нас варта было слухаць, — расказвае Юрый Ігруша.

Напэўна, нехта з тых, хто прайшоў Кінаспрынт, не будзе працягваць працу ў кіно, але, як лічыць Юрый Ігруша, праект усё роўна стане для ўдзельнікаў надзвычай карысным вопытам: чалавек, маўляў, разабраўся ў сабе і сваіх інтарэсах, а гэта таксама перамога.

На чарзе ў арганізатараў пасля прэм'еры кароткаметражак у Мінску іх прасоўванне на замежныя фестывалі, чым зоймецца прадзюсарскі бок. Магчыма, Кінаспрынт працягнецца чарговымі конкурсамі, і тады, спадзяёмся, фільмаў будзе знята яшчэ больш, праўда, ужо зусім на іншую тэму.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Друкуецца ў «Алесі»

СКАНДЫНАЎСКАЯ ХАДЗЬБА:

КАРЫСНА ДЛЯ ЗДАРОЎЯ, ЦУДОЎНА ДЛЯ НАСТРОЮ!

Адным з самых яскравых адкрыццяў у сферы фітнесу за апошняе дзесяцігоддзе стала скандынаўская хадзьба (Nordic Walking). Эфектыўная трэніроўка для мышачнай, сардэчна-сасудзістай, дыхальнай і нервовай сістэм нашага арганізма выдатна падыходзіць для падтрымання жыццёвага тонусу і добрай спартыўнай формы.

І многія сёння аддаюць перавагу прагулцы пехатой на свежым паветры, чым заняткам на трэнажорах у душнай спартзале.

КРЫХУ ГІСТОРЫІ

Скандынаўская хадзьба (іншыя назвы «паўночная хадзьба», «фінская хадзьба», «нардычная хадзьба») зарадзілася ў 1970-я ў Фінляндыі як адмысловая форма трэніровак для лыжнікаў. Заснавальнікам Nordic Walking лічаць вядомага фінскага лыжніка, алімпійскага чэмпіёна Юха Міета: менавіта ён першым у нацыянальнай зборнай сваёй краіны ўключыў у праграму летніх трэніровак бег з дзвюма палкамі па перасечанай мясцовасці, імкнучыся падтрымліваць сябе ў форме па-за межамі лыжнага сезона. Пазней практыка такой хадзьбы была падхоплена спартсменамі Германіі і Аўстрыі.

Папулярнасць да фінскай хадзьбы прыйшла ў сярэдзіне 1990-х, калі кампанія «Exel Oyj» упершыню прадставіла на выстаўцы спецыялізаваныя палкі для заняткаў Nordic Walking і правяла масіраваную рэкламную кампанію. У 2000 годзе была заснавана Міжнародная асацыяцыя аматараў скандынаўскай хадзьбы (INWA), якая стала актыўна ўдзельнічаць ва ўдасканаленні экіпіроўкі і прасоўванні прынцыпаў Nordic Walking у розных кутках свету. Цяпер у асацыяцыю ўваходзіць больш за 20 краін.

ЗДАРОЎЮ ПЛЮС

Хадзьба з палкамі, згодна з медыцынскімі рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, «вельмі эфектыўная для падтрымання паўнавартаснага стану здароўя, паляпшэння якасці жыцця чалавека і пры гэтым уяўляе цалкам бяспечныя і простыя формы фізічных заняткаў». Гэта аптымальны разлік карыснай кардыянагрузкі для тых людзей, каму проціпаказаныя актыўныя заняткі спортам, у каго ёсць сардэчна-сасудзістыя захворванні, праблемы апорна-рухальнага апарату.

Пры скандынаўскай хадзьбе эфектыўна працуюць як ніжняя, так і верхняя група мышцаў (плечавога пояса, спіны, шыі), а таксама брушнога прэса. Затое пазваночнік адпачывае — нагрузка з яго пераходзіць на палкі. Гэта асабліва важна для людзей, якія пакутуюць ад радыкуліту, артрозу і астэахандрозу: звычайна хада іх хутка стамляе, выклікае болі ў пазваночніку і суставах ног, а ў згаданым выпадку, наадварот, зніжаецца амартызацыйная нагрузка.

Супрацьпаказанні: нельга трэніравацца ў момант павышэння ціску, абвастрэння праблем з сэрцам, ныркамі, суставамі і калі вы падхапілі прастуду.

• Заняткі скандынаўскай хадзьбой праходзяць у любую пару года на адкрытым паветры — у зялёнай зоне вашага двара, найбліжэйшых скверы, парку, ляску і інш.

• Каб падтрымліваць добрую форму, досыць займацца 2-3 разы на тыдзень па 30—40 хвілін. Вынікі пачынаюць адчувацца ўжо праз месяц-паўтара рэгулярных заняткаў. А сапраўдныя, сур'ёзныя вынікі прыходзяць пасля 1 года заняткаў.

• Фізічныя нагрузкі на трэнажорах і ў спартзале па стане здароўя рэкамендуюцца далёка не ўсім, а вось няспешная пешая хада карысная ўсім да самага глыбокага ўзросту.

ЭКІПІРОЎКА

Для Nordic Walking выкарыстоўваюцца адмысловыя палкі, якія значна карацейшыя за класічныя лыжныя. Яны звычайна вырабляюцца з лёгкіх матэрыялаў — алюмінію, вугляпластыку, кампазіцыйных матэрыялаў. Даўжыня палак падбіраецца па формуле ў залежнасці ад росту і фізічнай падрыхтоўкі.

Адмысловы абутак не патрэбны, хоць замежныя фірмы такі прапаноўваюць. Красоўкі любога тыпу выдатна падыдуць для вашых прагулак.

Тэхніцы хады з палкамі навучыцца нескладана, яна вельмі натуральная. Усё як і звычайна: правая нага ідзе адначасова з левай рукой, а левая — з правай. Толькі рухі больш інтэнсіўныя. Пры адштурхванні палкі ўпіраюцца ў зямлю пад вуглом у 45°.

НАРДЫЧНАЯ ХАДЗЬБА:

✓ дазваляе спаліць калорый больш, чым пры звычайнай хадзе: выдаткі энергіі за адну гадзіну Nordic Walking складаюць прыкладна 400 ккал;

✓ актывізуе каля 90% усіх мышцаў нашага цела, стымулюе развіццё мускулаў плечавога пояса, спіны, ног;

✓ паляпшае работу сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, нармалізуе крывяны ціск, зніжае ўзровень «дрэннага» халестэрыну;

✓ падтрымлівае тонус мышцаў верхняй і ніжняй частак цела, трэніруе агульную вынослівасць і цягавітасць;

✓ памяншае ціск на пазваночнік, калені і суставы, павялічваецца шчыльнасць касцяной масы, зніжаецца рызыка ўзнікнення астэапарозу, памяншаецца рызыка пераломаў;

✓ падыходзіць для карэкцыі паставы і вырашэння праблем шыі і плячэй;

✓ паляпшае пачуццё раўнавагі і каардынацыю;

✓ вяртае да паўнацэннага жыцця людзей з праблемамі апорна-рухальнай сістэмы;

✓ даступная і бяспечная трэніроўка для людзей сталага ўзросту: дазваляе падтрымліваць спартыўную форму, жыццёвы тонус і добры знешні выгляд.

Для некаторых людзей скандынаўская хадзьба ператвараецца ў цэлую жыццёвую філасофію.

Алена ЦЯРЭНЦЬЕВА

■



У ЛЮТАЎСКІМ НУМАРЫ ЧАСОПІСА «АЛЕСЯ» ВАС ЧАКАЮЦЬ:

✓ Цікавая сустрэча з салісткай Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Аксанай Волкавай. Заслужаная артыстка Беларусі падзялілася ўражаннямі аб нядаўнім сумесным выступленні з Дзмітрыем Хварастоўскім ў лонданскай Каралеўскай оперы «Ковэнт-Гардэн».

✓ Сёлета спаўняецца 150 гадоў з дня нараджэння сусветна вядомага мастака Льва Бакста. Пра творчы шлях і неспадзяванасці лёсу гэтага таленавітага зямляка расказваецца ў артыкуле «Казачная птушка Льва Бакста».

✓ Каб весела і смачна адзначыць Масленіцу, абавязкова пазнаёмцеся з адмысловымі рэцэптамі бліноў ад Ларысы Мятлеўскай!

Прыемнага чытання!

■ Паэтычным радком

«НАВУЧЫЦЦА Б ЯШЧЭ БЫЦЬ ЗАЎСЁДЫ ЛЮДЗЬМІ»

Мікола МЯТЛІЦКІ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

МАЦІ КАСМАНАЎТА

На гэтай стрэчы шумна-гаваркой
Яна сядзела моўчкі за сталом,
Вачэй глыбокіх сіні супакой
Працяты быў зіхотлівым святлом.
І слухала, як слаўны сын-арол
Казаў пра бачны з высяў шар зямны.
І дзве слязінкі крапнулі на стол —
І болю ў сэрцы грымнулі званы.
Яна хусцінкі складзенай ражком
Павыцерла слязінкі і зырчэй
На ўсіх зірнула, пракаўтнуўшы ком,
Шчэ большаю адкрытасцю вачэй.
Паўгода самых змучаных начэй
І безліч дзённых зморлівых гадзін
З яе, слязой акропленых, вачэй
У хваляванні не сыходзіў сын.
І толькі, як кранулася зямлі
Пасадачная капсула, тады
Зноў васількамі вочы зацвілі,
І адступіў пагрозны цень бяды.
І не на шар, што цвёрда паўстае,
Пачуты зноў сыноўняю пятой, —
На сэрца мацярынскае яе
Ён прызямліўся ўдала ў ранак той.

* * *

Дзеда майго Ерапланам празвалі,
Было не ўгнацца за шпаркай хадой.
Усе на сяле ад яго адставалі,
Калі нёс ад студні вёдры з вадой,
Калі на пакос шыбаваў ён уранку,
Касою махаў аж да самай начы
Ці, ўзяўшы сякеру, дзень пляжыў дзялянку,
Цягаючы бёрны на дужым плячы.
Насіў над сабою ён копы, як хмары,
І цэпам хвастаў, разгарнуўшы, снапы.
Быў шчодрым заўсёды на светлыя мары,
І кажуць, на словы быў надта ж скупы.
Ды ўсё-ткі дагнала варожая куля,
Яе, спрытнаногі, адной не пазбег
Ў баі сталінградскім матулін татуля,
Крывёй арасіўшы прытоптаны снег.

* * *

Навучыліся многаму мы за вякі.
Запускаем навейшыя ў свеце станкі.
Здабываем з вады кісларод, вадарод.
Арашаем пустыні, дзе быў недарод.
У нябёсах лятаем, плывём пад вадой.
Водзім ціха сакрэты з урану рудой.
Хмарачосы будуем з бетону і шкла.
Міжпланетнага чуем размахі крыла.
За вякі навучыліся многаму мы.
Навучыцца б яшчэ быць заўсёды людзьмі.

* * *

Мне казалі: за лясамі
Ёсць бруістая крыніца,
Што, пакратаўшы губамі,
Піць і піць, не супыніцца.
Мне казалі: дзесь за рэчкай
Ёсць адно такое поле,
Дзе ў сухмень жыты і грэчка
Не пасохнуць аніколі.
Наўздагон яшчэ казалі:
Дзесь між зорак ёсць такая,
Што, як гляне — смутак з жалем
З сэрца тут жа уцякае.
Я ніколькі не ўсумніўся
І паверыў ім на слова,
Бо, дастойныя, яны ўсе
Пра цябе казалі, мова.

РАДОЎКА

Людміле

Свістам пугі страсянула хмару —
І паліўся жвавы, спорны дождж.
І кароў на быстрыцкім папары,
Бы ў маленстве, пасвіш басанож.
Кроплі з лёту падаюць на плечы,
Студзяць пот гарачы на ілбе.
І жаніх калішні, хмыр старэчы,
Зыркае з-за плота на цябе.
Дараваць ніяк усё не можа,
Папікае: замуж не пайшла!
Спынішся, падумаеш: «О, Божа,
Ўсё ж якой прадбачлівай была!
Ну якім, п'янчуга, быў бы мужам?
Лепш адной, як з гэтакім, пражыць».
Крочыць статак з пашы...
Ўслед па лужах
Зайчык з даўняй памяці бяжыць.

■ Выйсце ёсць!

НЕ ТРЭБА «ПАДСІЛКОЎВАЦЬ» ЗАЛЕЖНАСЦЬ

Наркаманія — гэта не прысуд. Нават калі вы страцілі ўсё, ад вас адвярнуліся блізкія, а на бальнічным ложку пачулі, як дактары шэптам дзеляцца паміж сабой: «Гэты малады чалавек ужо ніколі не стане нармальным». Выйсце ёсць заўсёды, упэўнены мае суразмоўцы Аляксандр Прыдвераў і Максім Пылёў. Можна і з попелу адрадзіцца, як легендарная птушка Фенікс, і пачаць новае жыццё. У хлопцаў ёсць усе правы на такія заявы — яны самі змаглі вырвацца з наркатычнай залежнасці і сёння гатовы дапамагаць іншым.

«Я Ў МІНУЛЫМ — НАРКАМАН»

— Наркаманію я параўноўваю з вайной, у якой супрацьстаяць два бакі: людзі, якія спажываюць, і тыя, хто не спажывае. Я пералез у другі акоп і на полі бою збіраю параненых, каб перацягнуць на свой бок, — заўважае Аляксандр. — Раней і ўявіць не мог, што буду дырэктарам фонду, які дапамагае алка- і нарказалежным. У мяне бацька вайсковец, услед за ім я прыехаў у Беларусь. Быў канец 90-х. Я не ведаў, дзе сябе прымяніць. Трапіў у новую кампанію, у якой нормай было ў выхадныя ўжываць марыхуану. Калі чалавек малады, ён усё ўспрымае за чыстую манету, і здавалася, нічога кепскага з гэтага не будзе. Ужо праз 3-4 месяцы зразумеў, што не магу справіцца. Мне стала дрэнна без наркотыка. З гэтага моманту пачынаецца барацьба. Інфармацыі абсалютна ніякай няма, у якія дзверы грукаць, не ведаеш. Наркотыкі цалкам авалодваюць тваёй воляй. Уяўляеце, у якой неадпаведнасці даводзіцца жыць залежнаму чалавеку, калі ўнутраны голас гаворыць, што так не павінна быць, ты не хочаш так жыць, а фізічны стан прымушае пастаянна ўжываць, каб хоць неяк аблегчыць ломку...

Унутраная патрэба расла, пайшлі больш цяжкія наркотыкі: гераін, метадон і гэтак далей.

— Але калі б была інфармацыя пра тое, дзе шукаць паратунку, напэўна, удалося б раней вызваліцца ад гэтай бяды?..

— Сапраўды, многія наркаманы не тое, што не хацелі завязаць — яны не маглі, бо не ведалі, куды ісці, хто зможа дапамагчы. Была інфармацыйная блакада. Афіцыйна наркаманіі не было. Яна існавала толькі на ўзроўні дэтаксікацыі. Для залежнага чалавека зняць сіндром — гэта справа двух тыдняў, а што рабіць з ім далей ніхто не ведаў. Парады накшталт «ідзі і больш не каліся» не дзейнічалі. У той час усюды спрабавалі навязаць думку, што «былых» не бывае, што ў любым выпадку цябе чакае смерць, і толькі яна выратуе ад пакут. У маім жыцці было каля 7-8 перадазіровак. Гэта быў цяжкі час, рэанімацыі. Апошнім разам, калі я знаходзіўся ў бальніцы, пачуў размову дактароў, якія ўжо «спісалі» мяне. І для мяне гэта стала моцнай матывацыяй, каб даказаць адваротнае. Дзякуй Богу, я пачуў, што ў некаторых маладых людзей гэта атрымліваецца. І трапіў у цэнтр, дзе атрымаў комплексную рэабілітацыю.

«Для залежнага чалавека зняць сіндром — гэта справа двух тыдняў, а што рабіць з ім далей ніхто не ведаў. Парады накшталт «ідзі і больш не каліся» не дзейнічалі».

— Спачатку мы займаліся кансультаваннем у рэабілітацыйным фондзе «Фенікс», а потым вырашылі, што назапашаных вопыту і ведаў дастаткова, каб займацца комплекснай недзяржаўнай стацыянарнай рэабілітацыяй, — уключаецца ў размову Максім. — Наш рэабілітацыйны цэнтр будзе працаваць па аўтарскай праграме, у рабоце якой прымаюць удзел як самі залежныя, так і спецыялісты ў галіне псіхалогіі і медыцыны. За аснову ўзята праграма, якая прымяняецца ў сусветных практыках рэабілітацыі нарка- і алказалежных. Гэта тое, што дапамагло нам самім. Я таксама ў мінулым — наркаман, а ў 2003 годзе знайшоў выйсце з гэтай праблемы. Выходзячы з уласнага вопыту, пастаянных высілкаў над сабой атрымаў шанц дапамагаць людзям і пры гэтым дапамагаць сабе. А сёння я гляджу на праблему яшчэ глыбей, бо атрымліваю другую вышэйшую адукацыю — псіхалагічную.

Медыкаменты патрэбны залежнаму чалавеку толькі першыя 2 тыдні. Пацыент атрымлівае дэтокс у дзяржаўных медыцынскіх установах. З яго выводзяць рэчывы, якія выклікаюць ломку. Пасля таго, як пацыент «пракапаўся» ў наркалогіі, фізічна яму быццам не дрэнна, але псіхалагічна ён не гатовы спыніцца. Чалавек не змяніўся, засталіся тыя ж схемы паводзін, узаемаадносіны з людзьмі, стэрэатыпныя рэакцыі на пэўныя рэчы. Большасць пацыентаў, якія выходзяць з медыцынскіх устаноў, зноў пачынаюць ужываць наркотыкі.Таму нішто лепш не падыходзіць для рэабілітацыі, як працяглая (каля 6 месяцаў) ізаляцыя. Важна дастаць чалавека са звыклага, нават агрэсіўнага асяроддзя, дзе сябры, знаёмыя ўжываюць наркотыкі, і нават сям'я падтрымлівае яго ў спажыванні, хоць збоку здаецца, што гэта не так.

«НЕШТА БЫЛО ПАРУШАНА»

— А чаму людзі становяцца наркаманамі?

Максім: Я даўно не веру ў выпадковасці. Калі чалавек трапіў у кампанію, дзе ўжывалі наркотыкі, гэтаму папярэднічаў шэраг падзей. Нешта было парушана: як правіла, гэта канфлікты ў сям'і, сацыяльных інстытутах. Не бывае такога, каб самадастатковы чалавек, у якога ўсё добра, раптам зайшоў да сябра, які прапануе паспрабаваць наркотык.

Аляксандр: З моманту першага ўжывання гісторыі залежных людзей напісаны як пад капірку. Мяняюцца толькі твары. Усё астатняе — праблемы з законам, са здароўем, парушэнне сацыяльных сувязяў, страта сяброў, знаёмых — аднолькавае. Наша задача — дакапацца, ад чаго чалавек пачынае спажываць, разблытаць клубок залежнасцяў і знайсці тыя псіхалагічныя траўмы, якія яму былі нанесены. Ліквідуем гэты недахоп — зможам дапамагчы.

— Няўжо сям'я садзейнічае наркаманіі?

М: Стан залежнага наўпрост звязаны са стаўленнем да праблемы бацькоў. Сузалежнасць — таксама хвароба. Таму асобна мы працуем і з блізкімі пацыента.

А: З выгляду сям'я можа быць ідэальнай. Суседзі дзівяцца, чаму ў такіх бацькоў дзіця стала наркаманам. Але справа ў тым, што часта на людзях мы адны, а дома, калі зачыняюцца дзверы, — іншыя. Напрыклад, бацька крычыць на маці, яна плача, а ў дзіцяці — псіхалагічная траўма. Бывае, што і празмерны клопат наносіць шкоду, блакіруе волю чалавека, яго патэнцыял. Да нас на кансультацыю трапляюць маладыя людзі, якім можа быць за 30. Але калі размаўляеш з імі, адчуваеш, што паводзіны іх, як у 15-гадовага, за якога ўсё вырашаюць бацькі, даюць грошы на кішэнныя выдаткі. Калі маладыя людзі трапляюць у праблему, проста ў канфлікт з бацькамі, яны не ведаюць, што рабіць, ідуць у двор, дзе ім прапануюць выйсце, якое іх задавальняе. Прывыканне да спайсу і розных курыльных сумесяў адбываецца практычна з першага-другога разу.

— І бацькам, чые дзеці толькі аднойчы паспыталі наркотык, ужо трэба прымаць меры?

А: Калі ў вас з'явіліся падазрэнні, што блізкія ўжываюць наркотыкі, неабходна звяртацца да спецыялістаў, тэлефанаваць, прыязджаць і хаця б атрымліваць інфармацыю пра тое, што можа быць далей. Наша дапамога ананімная! Часта сям'я баіцца расказаць аб праблеме. Не хоча, каб пра яе даведаліся суседзі, калегі. Наркаман бачыць, што родныя імкнуцца маскіраваць яго залежнасць, і пачынае імі маніпуляваць. Каб толькі не выносіць гэту праблему ў свет, бацькі гатовы нават адкупіцца.

ЧЫМ ХУТЧЭЙ, ТЫМ ЛЕПШ

— Чаму нельга зацягваць?

А: Вы не ведаеце, што спажываеце, якую дазіроўку сёння прапанаваў дылер. І кожнае спажыванне можа стаць для чалавека апошнім. Элементарны прыклад. Да нас звяртаецца пацыент і гаворыць, што хоча спыніцца, але сёння не гатовы ехаць на рэабілітацыю. На наступны дзень тэлефануе яго маці — і мне даводзіцца ехаць у рэанімацыю, дзе ўрачы 3 гадзіны змагаюцца за жыццё гэтага пацыента... Яго адратавалі, і толькі пасля гэтага ён прыняў рашэнне ехаць на рэабілітацыю.

— Што рабіць блізкім, калі наркаман адмаўляецца ад лячэння?

А: Прыходзіць да нас. Мы праводзім амбулаторны прыём пацыентаў і іх бацькоў **(гарадскі тэлефон — +375172999805, мабільны — +375291037575)**. Мы навучым бацькоў так сябе паводзіць, каб іх дзіця перастала ўжываць рэчыва, падкажам, як угаварыць пайсці ў рэабілітацыйны цэнтр. Калі ў іх няма сіл, каб прывесці дзіця да нас, выязджаем на дом. Мы ведаем псіхалогію залежнага чалавека, і нават размова дапамагае павярнуць яго ў бок рэабілітацыі.

М: Прычым гэта можа спрацаваць не адразу, хтосьці прыходзіць і праз паўгода. Многа выпадкаў, калі з чалавекам пагаварылі, ён адмовіўся ад дапамогі, запэўніў, што сам справіцца. Спажывае далей, даходзіць да свайго ўласнага дна, але згадвае, што выйсце ёсць.

«Наркаманію я параўноўваю з вайной, у якой супрацьстаяць два бакі: людзі, якія спажываюць, і тыя, хто не спажывае. Я пералез у другі акоп, і на полі бою збіраю параненых, каб перацягнуць на свой бок».

— Атрымліваецца, наркаманы па дапамогу звяртаюцца толькі тады, калі ўсё дрэнна. А ці можна спыніць іх, пакуль ім быццам бы добра?

А: Можна працаваць з бацькамі. Можна штучна стварацьнепрымальныя ўмовы, каб хутчэй падштурхнуць дзіця да нейкіх станоўчых зрухаў. Не трэба «падсілкоўваць» залежнасць. Добрае асяроддзе для ўжывання наркотыкаў — гэта калі чалавек можа вяртацца дамоў у чысты ложак да поўнага халадзільніка, атрымліваць кішэнныя грошы. Я раю бацькам не адчыняць дзверы, калі іх сын вяртаецца дамоў пасля ўжывання. Няхай зразумее, што вы не гатовы прымаць яго залежнага. Трэба размяжоўваць, дзе дзіця, а дзе яго залежнасць. Мы гатовы дзяліцца сваім бачаннем праблемы і вопытам, выступаць з лекцыямі ў навучальных установах. Наркаманія маладзее. З прыходам у Беларусь сінтэтычных наркотыкаў ды пад выглядам розных курыльных сумесяў стаў звыклым той факт, што курыць пачынаюць у даволі раннім узросце. Чалавек не разумее ў поўнай меры сур'ёзнасці праблемы. Бачыць толькі плюсы, задавальненне. Пра тое, што адбываецца далей, ніхто не гаворыць.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПРАЯЗНЫ — З ЛЮБОЙ ДАТЫ

З 5 лютага праязныя білеты на грамадскі транспарт у сталіцы можна купіць на 10, 15 і 30 дзён з любой даты.

Дагэтуль іх купля была абмежаваная каляндарным перыядам часу: напрыклад, праязны на месяц быў сапраўдны з 1-га чысла, на паўмесяца — з 1-га і з 15-га.

З 5 лютага электронны праязны на 10, 15 і 30 сутак можна набываць з любой даты па жаданні пасажыра на адзін, два, тры і чатыры віды транспарту з рознымі камбінацыямі. Карыстацца ўдасканаленымі праязнымі можна на працягу аплачанага перыяду часу з моманту актывацыі бескантактнай смарт-карткі, паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс».

Адсутнасць жорсткай прывязкі да тэрмінаў рэалізацыі дазволіць пасажырам набываць праязныя дакументы ў любы дзень. Пры гэтым падыход да вызначэння кошту білетаў застанецца ранейшым. Дарэчы, у другім квартале года ў сталіцы плануецца ўвесці праязныя на суткі, а да канца года — пагадзінныя. Таксама прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні праязных на грамадскі транспарт на квартал і паўгода.

КАБ ЛЕСУ ДЫХАЛАСЯ ЛЯГЧЭЙ

Дзякуючы лесаахоўным мерапрыемствам, праведзеным летась, плошча ачагоў шкоднікаў і хвароб лесу зменшылася ў параўнанні з папярэднім годам на 14,6 тысячы гектараў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.

Праведзеныя санітарныя высечкі і высечкі догляду дазволілі зменшыць колькасць дзейных ачагоў хвароб лесу, дзе патрабавалася правядзенне лесагаспадарчых мерапрыемстваў, на 6,2 тысячы гектараў, ці на амаль 13 працэнтаў да леташняга ўзроўню. Пад уздзеяннем ураганных і шквалістых ветраў былі пашкоджаны лясы з утварэннем ветравалаў, бураломаў на агульнай плошчы больш за 66 тысяч гектараў у аб'ёме 1 149,6 тысячы кубаметраў, што ў 1,2 раза менш у параўнанні з 2014 годам. Зменшылася гібель лясоў ад залішняга пераўвільгатнення (падтаплення) да 240 гектараў, ці на амаль 22 працэнты да ўзроўню папярэдняга года. У яловых насаджэннях, якія ўсыхаюць, праведзеныя аб'ёмы суцэльных санітарных высечак засведчылі тэндэнцыю стабілізацыі стану ельнікаў.

А НЕ ЧАПАЙ, ШТО НЕ ТВАЁ!

Браканьераў выдала сквапнасць

У Верхнядзвінскім раёне ў дзяржінспектараў атрымалася прыцягнуць да адказнасці двух браканьераў — бацьку і сына з вёскі Выдрыцкія. Мужчыны даўно былі на прыкмеце ў прыродаахоўных органаў.

— На ўзбочыне аўтадарогі Верхнядзвінск — граніца Расійскай Федэрацыі парушальнікі заўважылі збітага лася. Прайсці міма такой спакусы яны не змаглі: тушу перавезлі дадому, — расказала **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ**. — Амаль адразу на месца здарэння прыбыла група супрацоўнікаў Верхнядзвінскай міжрайінспекцыі — відавочцы ўжо паведамілі ім пра ДТЗ. Такі нечаканы паварот падзей прымусіў дзяржінспектараў праверыць «старых знаёмых». Ужо на двары яны ўбачылі сляды крыві, а на верандзе — тушу лася. Апроч таго, у жыллі знайшлі незарэгістраваную стрэльбу, хоць адзін з падазраваных меў легальную зброю, бо з'яўляўся паляўнічым. Яе, як і машыну, на якой перавозілі дзічыну, канфіскавалі. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

МЕСЯЦАВЫ ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 2016 ГОД

НАЙЛЕПШЫЯ ДНІ ДЛЯ ПАСАДКІ І СЯЎБЫ КАНКРЭТНЫХ КУЛЬТУР НА 2016 ГОД

Расліна	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік	лістапад	снежань
вельмі спрыяльныя для большасці раслін з падземнай ядомай часткай (караняплоды)	3-4	1-2, 6-7, 28-29	2-3, 25-26, 29-30	3-4, 23, 27-28, 30-31	1, 23-24, 25-26, 29-30	1-2, 21, 24-28	20-22, 25-26, 29-30	17-18, 21-22, 25-26	18-20, 23	15-16, 19	16-17
вельмі спрыяльныя для большасці раслін з надземнай ядомай часткай	11-12, 15-17, 20-21	11, 13-15, 18-19	10-11, 14-15	7-9, 12	8-9, 18-19	6, 15-17	12-13, 16-17	8-9, 13-14	5-7, 10-11, 14-15	2-3, 7-8, 10-12	4-5, 8-9, 12-13, 31
кветкі цыбульныя, клубневыя, з карэння	3-4, 24-27	1-2, 24-25, 28-29	25-26	3-4, 23, 30-31	1, 27-28	24-26	20-22, 29-30	17-18, 25-26	23, 27-25	15-16, 23-26	16-17, 21-23
кветкі з насення	11-12, 15-17, 20-21	11, 13-15, 18-19	10-11, 14-15	7-9, 12	8-9, 18-19	6, 15-17	12-13, 16-17	8-9, 13-14	5-7, 10-11, 14-15	2-3, 7-8, 10-12	4-5, 8-9, 12-13, 31
кабачкі, патысоны, гарбузы	11-12, 20-21	11, 18-19	14-15	12	18-19	6, 15-17	12-13	8-9, 13-14	6-7, 15	2-3, 11-12	8-9
бручка, рэпа	3-4, 24-27	1-2, 28-29	1, 25-26	-	1, 27-28	24-26	29-30	25-26	23	-	-
гарох, фасоля, бабы	15-17	13-15	10-11, 19-21	7-9, 16-19	12-15	10-13	6-9, 16-17	3-5, 13-14	-	-	-
суніцы садовыя (клубніцы), рэвень	15-17	13-15	10, 19-20	7-8, 16-18	12-14	10-12	6-8, 16-17	3-4, 13-14	10-11, 15	7-8	4-5
капуста (у тым ліку квацістая), спаржа	11-12, 20-21	11, 18	14-15	12	8-9, 18-19	6, 15-16	12-13	8-9	-	-	-
бульба, тапінамбур	1-2, 24-29	6-7, 26-27	23-26	3-4, 27-28	23-26	-	-	21-22, 24	18-20	15-16	21-23
цыбуля на пяро	15-17	13-15	10-11	7-9, 18-19	13-15	11-13	16-17	4-5, 13-14	10-11	7-8	4-5, 12-13, 31
цыбуля на рэпку	3-4, 24-27	1-2, 6-7, 28-29	2-3, 25-26, 29-30	3-4, 27-28, 30-31	1, 23-24, 27-28	21, 24-26	20-22, 29-30	17-18, 25-26	23	19	16-17
морква, пастарнак (на корань)	3-4, 24-27	1-2, 28-29	2-3, 25-26, 29-30	3-4, 23, 30-31	1, 23-24, 27-28	24-26	20-22	-	-	-	16-17
агуркі, кавун, дыня, кукуруза	11-12, 16-17	11, 13-15, 18-19	14-15, 19-21	12, 16-19	8-9, 12-15, 18-19	6, 10-13, 15-17	6-9, 12-13	3-5, 8-9	5-7, 14-15	2-3, 10-12	8-9
перац салодкі, баклажаны	11-12, 15-16, 20	11, 13-15, 18-19	10-11, 14-15	7-9, 12, 16-17	8-9, 18-19	6, 10, 15-17	6-8, 12-13	3-4, 8-9	5-7, 15	3, 10-11	8-9, 31
перац пякучы (любіць пасеў у знаку Стральца, незалежна ад фазы Месяца)	5-6	3-5, 30-31	1, 27-28	24-26	20-22	18-19	14-15	10-12	8-9	4-6	1-3, 26-27
пятрушка на зяленіва	15-17, 21	11, 19	10-11, 14-15	7-9, 12	9, 18-19	6, 15-17	7-8, 12-13, 16-17	8-9	6-7, 14-15	2-3, 11-12	-
пятрушка на корань	3-4, 25	1, 6-7, 28-29	1-3, 25-26, 29-30	3-4, 23, 30-31	1, 27-28	2, 24-26	20-22, 29-30	-	-	-	-
сланечнік	11-12, 20-21	11, 18-19	14-15	12	8-9, 18-19	6, 15-17	-	-	-	-	-
радыска, рэдзька, дайкон	3-6	1-7, 28-31	1-3, 25-30	3-4, 23-28, 30-31	1, 21-28	1-2, 21, 24-26, 28-30	20-22, 25-26, 29-30	17-18, 21-22, 25-26	-	-	-
салата, шпінат, мангольд	11-12, 20-21	11, 18-19	10-11, 14-15	7-9, 12	8-9, 18-19	6, 15-17	12-13	8-9	5-7, 14-15	2-3, 10-12	-
буракі	-	1-2, 6, 28-29	2-3, 25-26, 29-30	3-4, 23, 27-28, 30-31	1, 27-28	24-26	20-22, 25-26	-	-	-	-
сельдэрэй (карнявы)	3-4	1-2, 28-29	25-26	23	-	-	-	-	-	-	-
таматы	11-12, 15-17, 20-21	11, 13-15, 18-19	10-11, 14-15, 19-21	7-9, 12, 16-19	8-9, 12-15, 18-19	6, 10-13, 15-17	6-9, 12-13, 16-17	3-5, 8-9, 13-14	5-7, 10-11, 14-15	2-3, 7-8, 10-12	4-5, 8-9, 12-13, 31
кроп, фенхель, кінза, кмен, гарчыца	11-12, 15-17, 20-21	11, 13-15, 18-19	10-11, 14-15	7-9, 12	8-9, 18-19	6, 15-19	12-17	8-14	5-11, 14-15	2-8, 10-12	1-6, 8-9, 12-13, 31
хрэн	5-6	3-5, 30-31	1, 27-28	-	21-22	-	-	-	-	-	26-27
часнок	3-6	1-5, 28-31	1, 25-28	3-4, 23-26, 30-31	1, 21-22, 27-28	24-26	20-22, 29-30	17-18, 21-22, 25-26	18-20, 23	19	16-17, 26-27

Прочырк азначае, што саджаць і перасаджваць можна ў любы дзень спрыяльнай фазы месяца, выключаючы забароненыя дні.

ЗАБАРОНЕНЫЯ ДНІ ДЛЯ ПАСАДКІ, ПАСЕВУ І ПЕРАСАДЖВАННЯ РАСЛІН У 2016 ГОДЗЕ

Забароненыя дні для пасадкі і перасаджвання раслін у 2016 годзе	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік	лістапад	снежань
	7-9	8-10	6-8	5-7	4-6	3-5	2-4, 31	1-2, 30	1-2, 29-31	28-30	28-30

У поўню расліны атрымліваюць найбольшую сілу. Пасеў і пасадка не рэкамендуюцца, але калі поўня супадае са спрыяльным днём (Месяц у плодным знаку Задыяка), то можна.

УВАГА! У 2016 годзе вельмі мала цалкам спрыяльных дзён для пасеву раслін з надземным ураджаем. Не пакідайце без увагі поўні і дні ў апошняй чвэрці Месяца, але ў спрыяльным (плодным) знаку Задыяка.

ПОЎНІ Ў 2016 ГОДЗЕ

Поўні ў 2016 годзе	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік	лістапад	снежань
	22	23	22	22	20	20	18	16	16	14	14

МЕСЯЦАВЫ КАЛЯНДАР РАБОТ У САДЗЕ І АГАРОДЗЕ НА 2016 ГОД

Від работ	люты	сакавік	красавік	май	чэрвень	ліпень	жнівень	верасень	кастрычнік
унясенне арганічных угнаенняў	1, 18-24, 26-28	3-5, 21-23, 26-28, 31	1-2, 5-7, 10-14, 18-20, 22-24, 27-29	2, 20-22, 24-27, 29-31	1-3, 10-12, 16-18, 21-23, 26-30	1, 7-9, 18-20, 23-25	19-22, 24-26	6-10, 16-18, 21-23, 25-28	13-15, 18-20, 22-24
унясенне мінеральных угнаенняў	9-12, 14-16, 18-20	8-11, 13-15, 17, 18	1-2, 5-7, 10-14, 18-20, 22-24, 27-29	7-9	1-3, 10-12, 16-18, 21-23, 26-30	1, 7-9, 18-20, 23-25	1-3, 10-12, 19-23, 24-26, 28-30	6-10, 16-18, 21-23, 25-28	3-8, 24-26
узворванне, культывацыя, абганянне, рыхленне	1, 2, 19, 22, 26, 28	3, 8-11, 13-15, 17-23, 31	2, 3, 18-27, 29, 30	1, 2, 17-24, 27-29	1-2, 18-21, 23-26, 28-30	16-18, 20-23, 25-28	17-19, 22-24, 26-28	13-15 18-20, 23-27	13-25
закладка кампосту	-	1-3, 20, 21, 26-31	2, 3, 20-27	1, 2, 17-24, 27-29	1-2, 18-21, 23-26, 28-30	16-18, 20-23, 25-28	14-28	13-20, 23-27	13-18, 20-26
абрэзка галін і парасткаў (з 4-га дня пасля поўні да 2-га дня да маладзіка)	1, 21-28	1, 2, 22-31	1, 21-30	20-30	19-28	18-28	16-26	15-25	15-24
апырсканне, знішчэнне шкоднікаў	20-22, 24-26	1-3, 21-26	2, 18-22, 24-27, 29-30	1, 2, 22-24, 27-29	3-5, 7-12, 24-29	20-23, 25-28	17-19, 22-24, 26-28	13-15, 18-20, 23-29	13-18
інтэнсіўны паліў	20-22	3-6, 8-11, 13-15, 17-23, 31	5-7, 10-12, 18-20, 22-24, 27-29	2-4, 7-9, 15-17, 24-27, 29-31	3, 10-12, 16-18, 21-23, 26-30	16-20, 23-25, 28-30	1-3, 10-12, 19-22, 24-26	1, 6-10, 28-29	13-16
прышчэпка	20-22	8-11, 13-15, 21-23	5-7, 10-12, 18-20	-	16-18	2-3, 9-11, 13-14	-	-	-
пасадка, перасадка, пікіроўка	9-12, 14-16	1-3, 8-11, 13-15, 17-23, 26-29	5-7, 10-12, 16, 17, 22-24	акрамя маладзіка і поўні	3-5, 10-12, 30	18-20, 24-25, 28-30	10-12, 24-26	1-4, 6-8, 15-18, 20-23, 26, 28-30	акрамя маладзіка і поўні
праполка, прарэджванне ўсходаў	2, 18-20, 22-24	20-23	2-3, 18-27, 29	2-4, 7-9, 15-17, 24-27, 29-31	1-2, 18-21, 23-26, 28-30	16-18, 20-23, 25-28	17-19, 22-24, 26-28	13-15, 18-20, 23-27	13-18
нарыхтоўка насення	4-7, 9-12, 14-16, 22-24	8-11, 21-23	10-12, 16, 17	7, 9, 15,16	3-5, 10-14	16-23	3-5, 7-10, 12-14, 30-31	4-6, 8-10, 13-15, 18-20	15-18, 20-26

■ Хто каго?

«ВЫЙШАЎ ЖУЛІК НА «ПАМОСТ» І ЎМІГ ПАДЦІСНУЎ ХВОСТ...»

Што было — было, класіка не перапішаш: глуханямы Герасім утапіў Муму...

Ці ўсё ж такі не?..

Кажуць, непаваддаль нейкі дзядзька рыбу лавіў, змесціва сеткі ў лодку «высыпаў» і, што называецца, аслупянеў: сабака... Здаецца, жывы?!

Той — каб у рыбака сумненняў не заставалася — тут жа правае вочка расплюшчыў — на свет паглядзеў, потым — на лапы ўстаў, трохі абтросся і кажа:

— Во ліха, ледзь не патануў!

— Бог мой! Сабака... гаворыць?! — вушам не паверыў рыбак.

І ў Муму (у «тапельца») аж вочы з арбіт! Ён ніколі не чуў: мужык — і раптам... гаворыць.

Здымак, прапанаваны чытачам для таго, каб яны прыдумалі подпіс, як быццам таксама не маўчыць (паглядзіце на верхні): ён кожнаму нешта нагадвае, нешта падказвае, нават, магчыма, дыктуе...

І як жа шкада, што пад тую «дыктоўку» не ўсе бяруцца пісаць — дасылаць лісты ў рэдакцыю.

Але ж энтузіясты, дзякаваць богу, былі. І ёсць.

«Мае самы любімыя хатнія жывёлы — коні, каровы і сабакі, — піша **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**. — Некалі чытаў, як на дарозе каля Тальяці загінула сям'я. Не помню, колькі чалавек там было, але выжыў толькі сабака... І пасля гэтага ажно сем гадоў (!) ён не сыходзіў з месца трагедыі — чакаў гаспадароў... Пасля яго смерці мясцовыя жыхары, якія былі сведкамі гэтай незвычайнай адданасці, сабралі грошы на помнік. Ён, можа, і цяпер там стаіць, як сімвал вернасці».

Што радуе, яна, гэтая вернасць, як мяркуе **спадар Валерый**, досыць часта бывае ўзаемнай:

На прысягу да Андрэйкі,
Бач, прыехала сямейка:
Нават Жульку прыхапілі,
Што малому падарылі.
І на пляц яна — стралой...
Толькі дзе ж яе герой?

Яго і сапраўды тут цяжка адшукаць.

Спадарыня Валянціна Пабягайла з Ляхавічаў ведае, чаму:

Гаспадар сышоў...
І сумны
Па двары хадзіў Валет.
Ды сабака ён разумны —
Хутка ўзяў патрэбны след!
А прыбег — і ў задуменні:
Ну куды ісці-паўзці?
Усе ў аднолькавым адзенні...
Сябрука тут як знайсці?

Шанс ёсць, бо адшукаў жа гэты разумнік воінскую часць? Значыць, адшукае і гаспадара. Што далей будзе? На думку **спадарыні Раісы Васільевай з Гомеля**, збудуцца мары, бо сабачка гэты, што называецца, спаў і бачыў:

Вось бы да армейцаў
Як прыладкавацца, —
Будзе дзе пагрэцца,
Чым пачаставацца...

Ды і хлопцам-малойцам, паводле **спадарыні Ніны Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна**:

Грэх было б без дай прычыны
Апасацца дзедаўшчыны
Ды ад службы як «касіць»...
Янка восенню прызваўся.
Следам — Бобік увязаўся,
Каб служыць і не тужыць.

Бо яно ж і сапраўды весялей разам — і дома, і ў войску. Больш за тое, як лічаць жыхары сталіцы, **сужэнцы Ніна і Іван Астроўскія**,

Каб у арміі служыць,
Ведаў трэба многа.
І сабака можа быць
Добрай дапамогай.

Заканамернае пытанне: у чым — канкрэтна?

Адказ — у чарговым лісце. **Члены клуба па інтарэсах «Проба пяра» сярэдняй школы №3 г. Вілейкі** ад імя «цэнтральнай фігуры» пішуць:

Гаспадар дае прысягу:
Будзе край абараняць.
Ну а я — пакуль прылягу,
Зранку будзем вартаваць.

І ці толькі межы? «Неяк раз, — піша **спадар Мікола Кісель з Мінска**, — гасціў я ў сваёй сястры, і папрасіла яна, каб на вугал дома абвестку прыбіў: маўляў, асцярожна, злы сабака. Я, вядома, адразу ж згадзіўся, бо гэтае папярэджанне было вельмі дарэчы: сабака ў сястры і сапраўды нейкі звераваты. Ва ўсякім разе, пакуль я тупаў па двары, ён ледзь ланцуг не парваў — брахаў, як шалёны, усе пячонкі мне выеў. Вось я і не вытрываў: падышоў да будкі і сказаў гэтаму брахуну, што ён — не сабака, ён — дурань, казёл, асёл, баран...

А праз нейкі час, — працягвае спадар Мікола, — сабраўся я ад'язджаць, сышліся людзі, каб мяне праводзіць — цэлы натоўп. І ў ім, як потым высветлілася, быў той самы сабака. Нейкім чынам ён сарваўся з ланцуга. Але, што цікава, не зачапіў, не аббрахаў нікога. А вось да мяне падбег, грызянуў за нагу і... пайшоў да сябе ў будку».

Трэба разумець, супакоіўся — зрабіў сваю справу: паквітаўся за «казла». А здольны — апроч гэтага (паводле **спадара Міколы Кісяля**) адпомсціць і за многае іншае, бо вось зараз (гляньце яшчэ раз на верхні здымак) усім сваім выглядам кажа:

Вы запомніце, «дзядулі»,
Што завуць мяне — Палкан,
Што гатовы я пад кулі,
Калі знюхаю падман.
Самадурства не дарую
І «парву» за здзек,
Бо хоць нехта й навабранец,
Але ж — чалавек!

Для абсалютнай большасці ў гэтым, здавалася б, сумненняў няма і нават быць не можа! Але ж асобныя (у тым ліку і вайскоўцы), на думку **спадарыні Алены Бажок з Бабруйска**, лічаць іначай. Адкуль:

Выйшаў Жулік на «памост»
І... уміг падціснуў хвост!
Што — спужаўся аўтаматаў?
Не, — яфрэйтар крые матам.

Без яго, цяпер кажуць, рота не

пастроіцца, трактар не завядзецца, снег не пачысціцца, каровы не выдаяцца... Да слова, спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны неяк пісала, што ў іх на ферме адна даярка была. Як многія некалі, па дваццаць кароў рукамі выдойвала. Дык вось: мосціцца цётка Роза з вядром пад чарговую, а тая нагу нядобра паставіла. Даярка тады па-харошаму ёй, ласкавенька: «Ножку, Лыска, ножку!..». Яна, што называецца, і вухам не вядзе! Цётка тады крыкам: «Ножку... маць-перамаць!..» Карова тут жа пачула...

Анекдот, зноў жа, да слова. Маладая матулька тэлефануе мужу, хваліцца: «Радасць якая: наш маленькі першае слова сказаў...» — «А якое ж «мама» ці «тата»? — пытаецца муж. — «І не тое, і не другое... Ён, разумееш, з табурэткі звaліўся, ударыўся трохі... Карацей, ты не ўгадаў».

Але ж здагадаўся, бо ведае: дзіцятка вучыцца таму, што чуе ў сябе ў «даму».

І гэта цалкам лагічна...

Як і тое, што ўбачыў на здымку **спадар Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны**:

Паесці кашы з кацялка
Для шчанюка,
вядома ж, шчасце...
Ды і завуць яго — Палкан,
Як... камандзіра нашай часці.

Гэта ж падстава для гонару, ці не так? А яшчэ — для найшчырэйшай просьбы, якую «пачула» ад сабакі **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч:**

Я за армію — гарой...
Дык вазьміце ж мяне ў строй!
Паслужу без аўтамата —
Не глядзіце, што калматы...

І не толькі, як піша **спадар Валерый Гаўрыш**. Найперш — спачуваючы:

Што, сябрук, не ўдаўся ростам,
Каб граніцу бараніць?
Да аўчаркі не дарос ты —
Парушальнікаў лавіць?
Але ж маеш нюх сабачы...
Дуй у мытню — на ўдачу.

Спадар жа Альфрэд Тычко з вёскі Ідолта Мёрскага раёна, паглядзеўшы на здымак, вырашыў, што ўсё... якраз наадварот:

Не ўзя́лі Жучку ў мытню,
Хоць і зухаватая,
Хоць і лічыць сябе спрытнай...
Кажуць — стараватая.

Ну сапраўды, як па сённяшнім часе, дык не дагадзіць тым «кадравікам»! У адным месцы гавораць адно, у другім — калі верыць **спадару Анатолю Гарачову** — зусім супрацьлеглае:

Хлопцы ў войска ўсе прыйшлі
З позвай...
Праз ваенкамат.
А сабаку — не ўзялі
18 няма.

Не дарос ён, падобна?

Як падобна і на тое (гляньце яшчэ раз на здымак), што ён,

Сабака рад бы даць... узад,
Пакуль яго не згледзелі...
Ды тут палкоўніка загад:
Раўненне на сярэдзіну! —

Зрэшты, хто там камандуе, — таямніца, якая засталася за кадрам і можна (паводле **спадара Стасілевіча з Мінска**) хіба здагадвацца, што сабака

Ад здзіўлення сеў на лапы,
Нават «гаў» сказаць не змог,
Бо вось тут звычайны «прапар»
Пачуваецца, як Бог.

Нехта можа сказаць: ну і няхай сабе... Нехта ж — як той самы сабака на думку **спадара Гарачова**:

Пазірае ціха ззаду —
Штось яму нядужыцца...
Бо служыць — заўсёды рады,
Але ж не прыслужвацца!

Што праўда, тое праўда. Ва ўсе часы і не толькі ў войску. Але ж завяршыць гэты агляд хочацца невялічкім экскурсам у гісторыю — ад **спадара Мікалая Старых з Гомеля**:

На парадзе партызаны
Правялі з сабой казла,
Жаль: служывaму Палкану
Рота месца не знайшла.
Хоць сабака чалавеку
Самым першым сябрам стаў,
Службу нёс ён век ад веку —
Ваяваў і вартаваў...

Адно слова — сябар, ці нават брат — меншы... (Два мужыкі неяк заспрачаліся, у каго сабака разумнейшы. «Мой, уяўляеш, да дзвярэй падыдзе і кнопку званка націсне. А твой?» — пытаецца першы. — «Мой не націскае, — адказвае сябрук. — У яго ключ ад кватэры ёсць»).

А ў кватэры — адпаведна — адрас, на які можна выпісаць газету «Звязда». А можна паспрабаваць тую ж падпіску выйграць — у конкурсе на лепшы подпіс да здымка.

...На ім, папярэднім, быў, нагадаем, малады бацечка, які, закалыхаўшы ў вазку дзіця, соладка заснуў на лаўцы сам.

Як мяркуюць чытачы, найлепшыя подпісы пра гэтую салодкую парачку склалі **спадарыня Ніна Бурко з Бярэзіншчыны і Валянціна Гудачкова з Жыткавіч**. А таксама **спадары Мікалай Старых з Гомеля, Валерый Гаўрыш з Чавусаў і Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны**...

Вось з гэтым, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае — рэдакцыйнае. А значыць, прыз у выглядзе бясплатнай падпіскі на «Звязду» на другі квартал 2016 года накіроўваецца ў вёску Даўнары Іўеўскага раёна.

Хочаце, каб да вас? Не пытанне, як той казаў: здымак дадаецца — уважліва глядзіце, думайце, пішыце (кароткa — не больш за восем радкоў, дасціпна, па-беларуску) і ведайце, хто працуе, таму і шанцуе. Ці не так?

Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

Ад яе ж шчырыя прабачэнні тым, чые варыянты подпісаў не вытрымалі гэтым разам строгага конкурснага адбору. Але ў наступны...

Пішыце!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Извещение о проведении 18 февраля 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

№	Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Местонахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1.	Административное помещение общей площадью 289,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145924 (назначение: административное помещение) 1-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2	1 897 482 120	189 000 000
2.	Административное помещение общей площадью 402,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145928 (назначение: административное помещение) 3-й этаж 4-этажного здания	г.Минск, ул. Бабушкина, 48-6	2 590 179 960	259 000 000
3.	Административное помещение общей площадью 408,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145929 (назначение: административное помещение) 4-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7	2 628 427 080	262 000 000
4.	«Здание котельной. Литер Б2/к-кп» общей площадью 812 кв. м, инвентарный номер 500/C-23855 (назначение: здание неустановленного назначения)	г. Минск, ул. Бабушкина, 48	2 886 840 000	288 000 000
5.	«Склад (лит. Е 1/к)» общей площадью 349 кв. м, инвентарный номер 500/C-30523 (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)		3 319 320 000	330 000 000
6.	«Д 1/к-кп Заготовительный участок» общей площадью 362 кв. м, инвентарный номер 500/C-30547 (назначение: здание специализированное иного назначения)		2 957 280 000	290 000 000

Продавец имущества: ОАО «Реммех», ул. Бабушкина, 48, 220024, г. Минск.

Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в следующем порядке: в течение 15 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивается 35 процентов стоимости приобретенного имущества; оставшаяся часть стоимости оплачивается в течение 60 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **18 февраля 2016 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **08.02.2016 по 16.02.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону: (029) 663-51-16.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)296-35-94, (029) 663-51-16 (ОАО «Реммех»).

ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 10.03.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 6

№ п/п	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по документации
1	д. Жабичи, участок № 5, кадастровый номер 623288005101000024	0,2500 га	Подъездные пути удовлетворительные	40 721 300	8 144 300	5 193 800
2	д. Серпищено, участок № 1, кадастровый номер 623288014101000036	0,1958 га	Подъездные пути удовлетворительные	29 766 700	5 953 300	
3	д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, д. 15 «Б», кадастровый номер 623288001601000093	0,1521 га	Подъездные пути удовлетворительные	28 738 800	5 747 800	13 156 500

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171100 в ЦБУ № 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится 10.03.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 6.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **до 05.03.2016 г.** (последний день подачи заявления – **04.03.2016 г. до 17.00**) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99.

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:
19 февраля 2016 г. в 11.00
состоится открытый аукцион по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Рембыттехника» (продавец), в составе:

Лот № 1 – изолированное помещение с инв. номером 710/D-79275 (административное помещение) общ. пл. 743,0 кв.м, расположенное на по адресу: Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 44-1

Лот № 2 – изолированное помещение с инв. номером 710/D-79276 (административное помещение), общ. пл. 1378,8 кв.м, инженерные сети: водопровод с инв. ном. 710/C-73702 протяж. – 24,4 м; канализация с инв. ном. 710/C-73702 протяж. – 85,9 м; тепловая сеть с инв. ном. 710/C73703 протяж. – 64,1 м; ливневая канализация с инв. ном. 710/C-73706 протяж. – 228,8 м, расположенные по адресу: Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 44-2

Продавец предмета торгов	Открытое акционерное общество «Рембыттехника», УНП 700060113 (г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 44, р/с 3012420245017 ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйска, код 739)	
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369	
Место проведения торгов и подачи документов	ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30	
Общие сведения	**Лот № 1**	**Лот № 2**
Начальная цена продажи без НДС	**3 368 810 000 рублей**	**4 802 917 610 рублей**
Шаг аукциона	**10%**	
Размер задатка	**10% – 336 881 000 рублей**	**10% – 480 291 760 рублей**
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 369	
Информация о земельном участке	Для обслуживания продаваемого объекта выделен земельный участок пл. 0,0672 га, что составляет 3444/10000 долей в праве общего долевого постоянного пользования земельным участком пл. 0,1951 га с кадастровым номером 741000000006001085, который предоставлен в общее долевое постоянное пользование ОАО «Рембыттехника», доля в праве – 9836/10000 (0,1919 га), и РУП «Могилевэнерго», доля в праве – 164/10000 (0,0032 га). Правовой режим – право постоянного пользования	Для обслуживания продаваемого объекта выделен земельный участок пл. 0,1247 га, что составляет 6392/10000 долей в праве общего долевого постоянного пользования земельным участком пл. 0,1951 га с кадастровым номером 741000000006001085, который предоставлен в общее долевое постоянное пользование ОАО «Рембыттехника», доля в праве – 9836/10000 (0,1919 га), и РУП «Могилевэнерго», доля в праве – 164/10000 (0,0032 га). Правовой режим – право постоянного пользования
Характеристика предмета торгов	– помещение расп. в 3-этажном кирп. здании, г.п. 1986, перекрытия ж/бет., кровля совмещ. рулон., полы бетон., плитка, имеется: отопл., электроснабжение, крыльцо	- помещение расп. в 3-этажном кирп. здании, г.п. 1986, перекрытия ж/бет., кровля совмещ. рулон., полы бетон., плитка, имеется: отопл., электроснабжение, крыльцо, мощение: асф. бет. – 361 кв.м и бетон. плиты – 67 кв.
Условия продажи	При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%	
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 10 (Десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов	
Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество	Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при	
Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка	заключении договора купли-продажи	

Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 01 декабря 2015 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72-01-32, 72-13-93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
29 января 2016
Сушко С.А.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об эмиссии жилищных облигаций двенадцатого выпуска

Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой»

1. Полное и сокращенное наименование Эмитента:
на белорусском языке:
полное: Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВільнюсБуд»;
сокращенное: СТАА «ВільнюсБуд»;
на русском языке:
полное: Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» (далее – Эмитент);
сокращенное: СООО «ВильнюсСтрой».

2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1-й этаж, каб. 60, тел./факс: (8-017) 222-79-80, e-mail: Vilnusstroy@gmail.com.

3. Основные виды деятельности Эмитента.
Подготовка к продаже недвижимого имущества (код 70110 согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности ОКРБ 005-2006»).

4. Номер расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи жилищных облигаций двенадцатого выпуска Эмитента, наименование обслуживающего банка.
Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных облигаций двенадцатого выпуска Эмитента (далее – Облигации) будут поступать на счет Эмитента:
